Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
№ 91 (28455)
17 МАЯ 2017 г. СЕРАДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ
стар. 5–12



## Чым здзівіць «Маладзечна-2017»?

СТАР. 3



## Як жывецца ФАПу?

МС



## Даглядаем скуру

СТАР. 13

# Збожжавы фонд агранома Жыцянёва



У невялікім кабінеце Цэнтра дзіцячай творчасці ў гарпасёлку Целяханы Івацэвіцкага раёна знаходзіцца ўнікальная, у сваім родзе непаўторная калекцыя ўзораў насення збожжавых з усяго свету. Другой такой калекцыі па батанічнай і геаграфічнай разнастайнасці ў Беларусі няма. Яе стваbooў вядомы ў нашай краіне педагог Леанід ЖЫЦЯНЁЎ. Леанід Аляксеевіч — па адукацыі агранам, ужо больш за 20 гадоў з'яўляецца кіраўніком навуковага таварыства навучэнцаў «Колас», а навуковыя даследаванні педагога і яго вучняў вядуцца на базе вучэбна-доследнага ўчастка Цэнтра. У целяханскай калекцыі ў маленькіх слоічках і папяровых пакетах знаходзіцца больш за дзве з паловай тысячы ўзораў насення пшаніцы, жыта, ячменю, аўса, проса і іх дзікіх суродзічаў з усіх краін, дзе вырошчваюцца гэтыя расліны.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Ігар МАРТЫНАЎ, член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па нацыянальнай бяспецы:**

*«Адтэрміноўку ад службы ў арміі плануецца прадастаўляць тым, хто паступае ў магістратуру і інтэрнатуру. Раней у законе аб воінскім абавязку не было нормы, каб тым, хто скончыў першую ступень вышэйшай адукацыі і пераходзіць на другую, давалася ў год паступлення адтэрміноўка ад войска. Цяпер плануецца даваць ім такія адтэрміноўкі, каб яны маглі працягваць навучанне».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 17.05.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,8529 | ▼ |
| Еўра | 2,0440 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0329 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0700 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

■ Будзьце пільныя!

## ФІЛЬТРуйце прапановы

### Пачасціліся выпадкі махлярства ў дачыненні да пенсіянераў



**Яны звычайна ў ліку першых, хто адгукаецца на прапановы фінансавых пірамід, гандлёвых сетак, розных фірмаў і фірмачак са сферы паслуг набыць нешта быццам бы вельмі карыснае па зніжанай цане. Гэтым і карыстаюцца махляры. Імі, у прыватнасці, распрацаваны тэхналогіі падману і навязвання непатрэбных тавараў і паслуг пад выглядам клопату аб вашым дабрабыце і здароўі.**

### Не ведала баба клопату... ды надбала фільтр

Недзе ў першай палове дня за амаль 80-гадовых Антаніны Мікалаеўны і яе мужа Барыса Сцяпанавіча, якія, між іншым, жывуць на праспекце Газеты «Звязда» ў Мінску, завітала суседка па кватэрнай пляцоўцы з навіной: «ЖЭС разам з «Водаканалам» праводзяць сход жыхароў пад'езда. Нешта наконт якасці водаправоднай вады».

СТАР. 4

■ На слыху

## АЗІМЫЯ ЗАМАРАЗКАЎ АМАЛЬ НЕ СПУЖАЛІСЯ

### Аднак на поўдні краіны больш пацярпелі ягаднікі і квітнеючыя сады

**Аб гэтым паведамілі спецыялісты НАН Беларусі і Мінсельгасхарчу падчас брыфінгу на тэму «Уплыў неспрыяльных умоў надвор'я на ход пасяўной кампаніі» ў прэс-цэнтры БЕЛТА.**

### БЕЗ ІСТОТНАЙ ШКОДЫ



**Намеснік генеральнага дырэктара Навукова-практычнага цэнтра НАН Беларусі па земляробстве Эрома УРБАН** адзначае, што гэтай вясной быў нетыповa працяглы перыяд нізкіх тэмператур. Але вясновыя замаразкі не нанеслі істотнай шкоды пасевам азімых збожжавых культур. Спецыяліст паведаміў, што толькі на некаторых палях, дзе тэмпература паветра апускалася ніжэй за мінус 5 градусаў, назіраецца падмярзанне лісця. Акрамя таго, пераўвільгатненне глеб у Віцебскай вобласці і некаторых раёнах Мінскага рэгіёна запавольвала ход веснавых палявых работ, а халаднаватае надвор'е стрымлівала інтэнсіўны рост раслін.

СТАР. 3

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!
ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА,
5 разоў на тыдзень!
Пачалася падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе 2017 года!
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# У СЯБРОЎСТВА — ДОБРАЯ БУДУЧЫНЯ

## Беларусь і Кітай дамовіліся ўмацоўваць супрацоўніцтва і развіваць узаемадзеянне па новых кірунках

**Такі вынік перагавораў Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі і Старшыні КНР Сі Цзіньпіна, якія адбыліся ўчора ў Пекіне.**



Фота БЕЛТА.

Кіраўнікі дзяржаў падзяліліся думкамі аб форуме «Адзін пояс і адзін шлях», праведзенне якога абмяркоўваецца ўжо ва ўсім свеце. «Гэта вельмі моцны крок, які вы змаглі зрабіць, і самае галоўнае — прыцягнуць да гэтага больш за 100 краін нашай планеты. Мы ганарымся тым, што былі першымі ў Еўропе і адными з першых у свеце, не проста падтрымаўшы ідэю «Аднаго пояса і аднаго шляху», а распачаўшы рэалізацыю гэтага маштабнага праекта на тэрыторыі Беларусі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Беларускі лідар прызнаўся, што абмяркоўваў праведзенне мерапрыемства з прадстаўнікамі многіх краін, адзначыўшы, што самым яркім на форуме было ўступнае слова Старшыні КНР. Кіраўнік дзяржавы таксама адзначыў цікавую форму правядзення мерапрыемства і яго маштабнасць, яркую праграму для ўдзельнікаў і магчымасць правесці двухбаковыя сустрэчы.

Асноўны час перагавораў лідары дзвюх краін прысвяцілі абмеркаванню праектаў, якія рэалізуюцца, і перспектыў рэалізацыі новых ініцыятыў, паглыблення супрацоўніцтва ў самых розных галінах.

Сумеснае развіццё беларуска-кітайскага супрацоўніцтва не абмяжоўваецца эканамічнай і інвестыцыйнай сферамі. Так, Беларусь усяляк падтрымлівае рашучасць Кітая браць на сябе абавязацельства абараняць мір ва ўсім свеце. «Прыкладам гэтаму з'яўляюцца ўзаемадносіны нашых краін у галіне забеспячэння бяспекі, ваенная сферы і па лініі спецыяльных службаў, — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка. — Стварэнне сумеснай пастаянна дзеючай рабочай групы па барацьбе з каляровымі рэвалюцыямі і супрацьдзеянні міжнароднаму тэрарызму, унутранаму сепаратызму і рэлігійнаму экстрэмізму надасць новы імпульс узаемадзеянню ў гэтых сферах».

Беларусь таксама зацікаўлена ў далейшым пашырэнні ваенна-тэхнічнага супрацоўніцтва, у тым ліку рэалізацыі праектаў па мадэрнізацыі рэактыўнай сістэмы залпавага агню «Паланэз», распрацоўцы сучасных узораў узбраення, ваеннай тэхнікі і іншай экспартна арыентаванай прадукцыі ваеннага і двайнога прызначэння.

Акрамя таго, Дзяржаўны сакратарыят Савета бяспекі Беларусі і Міністэрства грамадскай бяспекі Кітая выходзяць на падпісанне новых пагадненняў, якія будуць спрыяць наладжванню больш цесных кантактаў па такіх важных кірунках, як следчая і экспертная работа, узгодненая міграцыйная палітыка.

«Наша ўзаемадзеянне ў галіне бяспекі ў поўнай меры адлюстроўвае ўзровень даверу нага ўсебаковага стратэгічнага партнёрства і ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва», — падкрэсліў беларускі лідар.

Новыя шляхі для пашырэння ўзаемадзеяння ёсць і ў турыстычнай галіне. Напрыклад, краіны вывучаюць магчымасць узаемнага ўвядзення бязвізавага рэжыму да 30 дзён. Кіраўнікі дзяржаў даручылі кампетэнтным органам прадметна прапрацаваць гэтае пытанне.

У цэнтры ўвагі Аляксандра Лукашэнкі і Сі Цзіньпіна таксама была дзейнасць індустрыяльнага парка «Вялікі камень», паведамляе прэс-служба беларускага лідара. Прэзідэнт паведаміў, што напярэдадні візіту ў Кітай падпісаў указ, які стварае новыя прывабныя ўмовы працы для яго рэзідэнтаў. Бакі канстатавалі, што неабходна працягваць работу па прыцягненні ў парк новых кампаній, ствараць ім камфортныя ўмовы для працы.

Абмяркоўвалася ў час перагавораў і супрацоўніцтва ў інвестыцыйнай і крэдытна-фінансавай сферах. Кітай разгледзіць магчымасць выдзялення Беларусі сродкаў для завяршэння мадэрнізацыі нафтаперапрацоўчых заводаў. Гэтыя праекты тэхнічна складаныя, а ўладальнікамі тэхналогій з'яўляюцца ў асноўным еўрапейскія і амерыканскія кампаніі, таму ад магчымасці прадастаўлення нязвязаных крэдытаў залежыць паспяховасць і эфектыўнасць іх рэалізацыі. Паводле ацэнак спецыялістаў, неабходная сума складае каля $1 млрд.

Старшыня КНР адзначыў, што Беларусь і Кітай дабіліся значных вынікаў у развіцці двухбаковага супрацоўніцтва і заўсёды дасягаюць кансэнсусу па прынцыповых пытаннях. «Я ўпэўнены ў добрай будучыні нашых адносін», — заявіў ён.

Па выніках сустрэчы бакі падпісалі міжурадавае пагадненне аб тэхніка-эканамічнай дапамозе, якая будзе накіравана на падтрымку будаўніцтва сацыяльнага жылля ў Беларусі. Акрамя таго, бакі заключылі міжурадавае пагадненне аб развіцці міжнародных грузавых перавозак і супрацоўніцтве ў рэалізацыі канцэпцыі будаўніцтва эканамічнага пояса Шаўковага шляху.

■ Тры пытанні да ўлады

# «Талакой наводзім глянец»



**Клечычына лідзіруе ў Мінскай вобласці па навядзенні парадку на зямлі. Пазалетась за гэтую працу раён узнагароджаны Ганаровай граматай Мінскага абласнога Савета дэпутатаў. Сапраўды, за некалькі гадоў непазнавальна змяніўся сам райцэнтр, папрыгажэлі вёскі... Пра гэтыя перамены і наша гутарка са старшынёй Клецкага райвыканкама Генадзем САЛАЎЁМ.**

***— Генадзь Міхайлавіч, чула, што па навядзенні парадку на зямлі ў раёне напрацаваны цікавы вопыт?***

— Добраўпарадкаванне прадугледжвае некалькі напрамкаў: культура землеробства, знос старых і пустуючых дамоў, прыцягненне ў гаспадарчы абарот зямельных участкаў і аб'ектаў маёмасці, якія не выкарыстоўваюцца. Мы ўвялі наступную практыку: бяром канкрэтны населены пункт, падключаем усе структуры і падраздзяленні, што знаходзяцца на тэрыторыі раёна, і наводзім тут глянец. Талакой працуюць грамадскія арганізацыі, сацыяльныя і выратавальныя службы, прамысловыя прадпрыемствы, прадпрыемствы аграпрамысловага комплексу. Кожны адказвае за свой участак работы. За апошнія гады ўвялі ў севазварот 1300 гектараў зямлі, у тым ліку летась — 81 гектар, рэкультывавалі 118 прысядзібных участкаў. Участкі, дзе раней размяшчаліся закінутыя дамы, гаспадаркі засяваюць культурнымі раслінамі.

У раёне налічваецца 259 трухлявых і 1300 пустуючых дамоў. Адны зносяцца — з'яўляюцца другія, паколькі вёска старэе, колькасць насельніцтва змяншаецца. Таму самае галоўнае для нас — прымусіць уласнікаў даглядаць сваю спадчыну.

***— Якім чынам вы гэта робіце?***

— Работа вядзецца паводле Указа Прэзідэнта Беларусі №100 «Аб мерах па ўдасканаленні ўліку і скарачэнні пустуючых і старых дамоў у сельскай мясцовасці». Сёння трухлявыя дамы павінны выкупляцца або са згоды спадчыннікаў перадавацца для далейшага карыстання. Практычна ўсе яны закінутыя — псуюць выгляд вёскі. Спадчыннікам яны не патрэбныя. Мы ўключаем гэтыя дамы ў рэестр безгаспадарчай маёмасці, і суд выносіць рашэнне аб прызнанні жылога дома безгаспадарным і перадачы яго ва ўласнасць адпаведнага сельвыканкама. Але дзе гарантыі, што не знойдуцца сваякі са сваімі прэтэнзіямі да органаў мясцовай улады: чаму «разбурылі» радавое гняздо без іх на тое згоды? Атрымліваецца, што сельскія выканаўчыя камітэты не абаронены ў гэтым плане. Лічу, што наспеў час унесці ва Указ змяненні, якія б дазволілі ўзмацніць адказнасць спадчыннікаў і абараніць сельвыканкамы.

***— Ці шмат у раёне аб'ектаў нерухомасці, якія не выкарыстоўваюцца? І як яны вяртаюцца ў гаспадарчы абарот?***

— Гэта ў асноўным аб'екты сацыяльнай сферы: фельчарска-акушэрскія пункты, школы, дзіцячыя сады, магазіны, клубы. У першую чаргу мы аддаём пустыя будынкі бязвыплатна прадпрыемствам, гаспадаркам для пераабсталявання іх пад жыллё. Прыватнаму бізнесу прадаём маёмасць на аўкцыёнах або прапануем у арэнду. Адзін з прадпрымальнікаў, напрыклад, у будынку былога сельвыканкама арганізаваў кавярню. Выстаўлялі на продаж і гарадскі кінатэатр «Іскра», але пакупнік не знайшоўся. Цяпер яго рэканструюем пад цэнтр дзіцячай творчасці.

Два гады таму ў адной з сельскіх школ, якая пуставала, створана аддзяленне кругласутачнага знаходжання для пажылых людзей. Дзіцячы сад перадалі акцыянернаму таварыству «Морач», новы гаспадар адкрыў тут гасцінічны комплекс, вытворчасць па хлебапячэнні, пункт грамадскага харчавання. Нявыкарыстаныя будынкі магазінаў, якія належаць спажывецкай кааперацыі, прапануем у арэнду або выстаўляем на таргі.

У раёне шмат азёр, сажалак. На дзесяць з іх знайшліся арандатары. Яны добраўпарадкавалі, акультурылі берагі, зарыбілі вадаёмы. Але перш чым прапанаваць іх бізнесу, выслухоўваем мясцовых жыхароў. Тады па выніках абмеркавання на сесіі раённага Савета дэпутатаў прымаем адпаведнае рашэнне. Як правіла, праблем з мясцовымі жыхарамі не бывае, знаходзім залатую сярэдзіну паміж іх інтарэсамі і інтарэсамі прыватніка.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.** *lazovskaya@zviazda.by* ■

■ Парламенцкі дзённік

# МАЦУЕМ АБАРОНУ

## Ад воінскага ўліку да баявой падрыхтоўкі

**Пастаянная камісія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па нацыянальнай бяспецы абмеркавала пытанні, якія дапамогуць больш якасна падрыхтаваць змяненні і дапаўненні ў заканадаўства Беларусі аб абароне.**

Выязное пасяджэнне адбылося на базе ваеннага камісарыята Кастрычніцкага раёна сталіцы і 120-й гвардзейскай асобнай механізаванай брыгады. Там члены камісіі абмеркавалі моманты, непасрэдна звязаныя з ваеннай бяспекай нашай краіны.

— Мы хацелі паглядзець, як тыя змяненні і дапаўненні, што паступілі ад кіраўніка дзяржавы 4 студзеня 2017 года ў парламент і датычыліся «Закона аб абароне», будуць выкарыстоўвацца на практыцы, — абазначыў мэту мерапрыемства **старшыня Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы Валянцін МІХНЕВІЧ.**

— Адным з асноўных дакументаў, які рэгламентуе кірункі абарончай дзейнасці Беларусі, з'яўляецца Ваенная дактрына, зацверджаная ў 2016 годзе, а таксама шэраг законаў па пытаннях абароны, — расказаў **дэпутат Ігар МАРТЫНАЎ.** — Сёння ёсць прапановы ўнесці змены ў восем законаў Рэспублікі Беларусь, напрыклад у законы «Аб абароне», «Аб воінскім абавязку і воінскай службе», «Аб Узброеных Сілах», «Аб мабілізацыйнай падрыхтоўцы і мабілізацыі»... Змяненні будуць унесены з улікам як вопыту нашай краіны, так і тых падзей, што цяпер адбываюцца ў свеце. На выязным пасяджэнні камісія разгледзела пытанні ваеннага планавання, камплектавання Узброеных Сіл мабілізацыйнымі рэсурсамі ў ваенны час, статусу ваеннаслужачых у ваенны час. Можна спадзявацца, што законапраекты з унесенымі праўкамі будуць разглядацца падчас першага чытання на пасяджэнні Палаты прадстаўнікоў на бягучай сесіі.

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ.** *yurgel@zviazda.by* ■

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

## Макрон і Меркель дамовіліся аб рэфармаванні Еўрасаюза

Новыя ўлады Францыі пасля перамогі на прэзідэнцкіх выбарах Эмануэля Макрона пачнуць работу над рэфармаваннем Еўрасаюза сумесна са сваімі нямецкімі калегамі. «Мы можам разам з нашымі камандамі працаваць над праектам дарожнай карты для Еўрасаюза і зоны еўра», — абвясціў Макрон па выніках сустрэчы з Ангелай Меркель у Берліне. Канцлер ФРГ, у сваю чаргу, заявіла аб тым, што Германія і Францыя маюць намер надаць новую дынаміку двухбаковаму супрацоўніцтву ў рамках сумеснай працы над еўрапейскімі ўнутранымі тэмамі, уключаючы падтрымку еўразоны і палітыку ў галіне калектыўнай бяспекі.

## Хілары Клінтан стварае новую палітычную арганізацыю

Гэта зроблена з мэтай падтрымкі тых ініцыятываў, якія яна высоўвала падчас выбарчай кампаніі. Адпаведная заява была апублікавана на старонцы Клінтан у Twitter. Новая арганізацыя атрымала назву Onward Together (можна перакласці як «Разам наперад»). «Мы запускаем Onward Together, каб людзі натхніліся і ўдзельнічалі ў палітычных працэсах, каардынавалі свае дзеянні і нават вылучалі свае кандыдатуры на выбарах», — напісала Клінтан.



## Вызначана мінімальная маса зоркі

Амерыканскія астрафізікі ацанілі мінімальна магчымую масу зоркі. Паводле ацэнак навукоўцаў, аб'екты, якія ў 15 разоў лягчэйшыя за Сонца (ці ў 70 разоў цяжэйшыя за Юпітэр), усё яшчэ могуць выпрацоўваць дастаткова энергіі, каб свяціць па прынцыпу трыльённай гадоў і лічыцца зоркамі. У гэтым выпадку ў нетрах такіх свяцілаў па-ранейшаму будуць працягваць тэрмаядзерныя рэакцыі, што адрозніває іх ад карычневых карлікаў — нябесных цел, якія займаюць прамежкавае становішча паміж зоркамі і планетамі.

# РАЗВІТАННЕ З ПАРЫЖАМ

## Зборная краіны па хакеі завяршыла выступленне на чэмпіянаце свету

**Гульнёй супраць нарвержцаў, у якой нашы хакеісты атрымалі перамогу 4:3, для каманды Беларусі скончыўся 81-ы чэмпіянат свету па хакеі. Гэты матч стаў другім пераможным для нашай каманды, яшчэ адну вікторыю яны атрымалі некалькімі днямі раней над славенцамі 5:2.**

Такім чынам, у сямі матчах групавога раўнда падапечныя Дэйва Льюіса набралі 7 ачкоў, што на адзін бал больш, чым на чэмпіянаце свету мінулага года ў Піцеры, і фінішавалі на 13-м месцы, што на адну пазіцыю горш за вынік 2016 года (тады ў Расіі беларусы былі дванаццатымі). Ніжэй нашай зборнай сёлета размясціліся толькі каманды Славакіі, Славеніі і Італіі. Адзначым, што дзве апошнія зборныя развітваюцца з элітным дывізіёнам чэмпіянату свету.

Нагадаем таксама, што 19 мая будзе прынята рашэнне аб месцы правядзення чэмпіянату свету 2021 года, на якое прэтэндуе і Беларусь. Напярэдадні кіраўнік Міжнароднай федэрацыі хакея Рэнэ Фазель адзначыў, што заяўкі краін, якія жадаюць правесці планетарнае першынство, вельмі моцныя, аднак у беларусаў і латышоў сумесна шанцаў на перамогу больш.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** *lobazhevich@zviazda.by*

■ Фестывалім!

# Да канцэртаў — гатовы

## Праграма на вершы Купалы і Коласа, юбілей «Сяброў» і выступленні сучасных паэтаў

**2 і 3 чэрвеня пройдзе XVII Нацыянальны фестываль беларускай песні і паэзіі «Маладзечна-2017». Гэта адзінае свята, што мае такі статус: усе творы выконваюцца на нацыянальнай мове. Яскравы конкурс маладых выканаўцаў, выступленне Нацыянальнага акадэмічнага аркестра Беларусі, а таксама праграма, створаная спецыяльна да 135-годдзя Янкі Купалы і Якуба Коласа, — вось асноўнае, чым сёлета будзе здзіўляць любімы фестываль.**

— Канцэрты пройдуць пад знакам адной з галоўных падзей у культурным жыцці гэтага года — 135-годдзя з дня нараджэння народных паэтаў Беларусі Янкі Купалы і Якуба Коласа. Гэтым юбілеем, тэмай творчасці песняроў будуць прасякнуты ўсе фестывальныя мерапрыемствы, — адзначыла **першы намеснік міністра культуры Беларусі Ірына ДРЫГА.** — Адкрыецца фестываль галоўнай падзеяй — конкурсам маладых выканаўцаў эстраднай песні. 2 чэрвеня пройдуць адразу два туры. Падчас апошняга яны выканаюць песні ў суправаджэнні аркестра пад кіраўніцтвам Міхаіла Фінберга на сцэне летняга амфітэатра Маладзечна.

На вечаровым канцэрце-адкрыцці адбудзецца падвядзенне вынікаў конкурсу. А таксама будзе прэзентавана зусім новая праграма — «Купала і Колас. Вы нас гадавалі», аўтарам і складальнікам якой з'яўляецца Міхаіл Фінберг. У ёй будуць і знаёмыя публіцы творы, напісаныя на словы гэтых паэтаў, і абсалютна новыя, якія прэзентуюць упершыню. Завершыцца першы дзень святочным салютам.

Вельмі насычанай чакаецца і праграма другога дня фестывалю — адбудзецца канцэрт акадэмічнай музыкі ў дзіцячай музычнай школе. Штогод там прэзентуюць маламядомыя творы мінулых эпох — кампазітараў XVII, XVIII і XIX стагоддзяў. У гэты ж дзень артысты фестывалю выступяць у вёсцы Чысць. Канцэрт-закрыццё прымеркаваны да юбілею ансамбля «Сябры». Яго вядучым будзе народны артыст Беларусі Анатоль Ярмоленка.

— Падтрымліваць высокі ўзровень нацыянальнага фестывалю зусім няпроста, — разважае **мастацкі кіраўнік — дырэктар**



**Нацыянальнага акадэмічнага аркестра Беларусі Міхаіл ФІНБЕРГ.** — Некаторыя аўтары забараняюць выконваць свае творы — і гэта надзвычай прыкра. Але мы працуем на карысць нашай роднай Бацькаўшчыны. Няма такога кутка ў Беларусі, дзе ні пабываў бы наш аркестр. Нядаўна мы вярнуліся з Вілейкі, там распачалі новы цудоўны фестываль у касцёле... Ужо рэпецыраваў праграму на творы Купалы і Коласа, якую адыграем на фестывалі песні і паэзіі, — атрымалася вельмі каларытна.

Пра тое, што ў Маладзечне ўсіх гасцей сустрэнуць з традыцыйнай гасціннасцю, расказала **дырэктар Палаца культуры Маладзечна Святлана САРОКА:**

— Горад гатовы да фестывалю: зроблена афармленне, падрыхтаваныя асноўныя ўстановы, у якіх будуць праходзіць мерапрыемствы, а таксама канцэртныя пляцоўкі. Цяпер ідзе вялікая работа з рэжысёрамі і пастаноўшчыкамі. Нам надзвычай прыемна вітаць у сябе творчую эліту Беларусі — паэтаў, кампазітараў, выканаўцаў — адбудзецца шмат добрых і цёплых сустрэч. Прымуць актыўны ўдзел народныя ўзорныя калектывы, лепшыя творцы. Распачнецца фестываль нават раней за 2 чэрвеня — з 31 мая ў нас пачнуць праходзіць прэзентацыі і сустрэчы з прадстаўнікамі Саюза пісьменнікаў Беларусі.

Другі год працуе афіцыйны сайт фестывалю, падкрэсліла Святлана Сарока, на ім можна знайсці ўсю актуальную інфармацыю — festival.by.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.** *nina@zviazda.by*

# АЗІМЫЯ ЗАМАРАЗКАЎ АМАЛЬ НЕ СПУЖАЛІСЯ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

На пасевах азімага жыта, пшаніцы і трыцікале адзначаецца фаза «выхад у трубку», але з-за нізкіх начных тэмператур памяншылася інтэнсіўнасць паступлення і засваення раслінамі азоту, што неспрыяльна адбіваецца на развіцці раслін. «У перыяд трубкавання фарміруюцца такія важныя складальнікі ўраджаю, як даўжыня коласа, колькасць каласкоў у ім. Недахоп азоту ў гэты час прыводзіць да апаадзення ніжніх каласкоў. Для забеспячэння добрай ураджайнасці азімых збожжавых неабходна правесці другую падкормку азотнымі ўгнаеннямі», — падкрэсліў Эрома Урбан. А яшчэ эксперт лічыць, што сёння стан пасеваў азімага рапсу ацэньваецца як добры і здавальняючы, каля 90% пасяхова перанесла замаразкі.

У сваю чаргу, **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення раслінаводства Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Васіль ЯДЛОЎСКІ** паведамляе, што сёлета ўзімку былі спрыяльныя ўмовы для азімых культур, таму гібель пасеваў у параўнанні з мінулым годам невялікая. «Гібель пасеваў азімых збожжавых культур склала ўсяго 0,6% ад пасеянай плошчы, страта азімага рапсу — 11,5%, — удакладніў ён. — Гэта амаль у межах допушчальных аб'ёмаў. Таму спадзяёмся, што ў гэтым годзе мы атрымаем больш рапсу на зерне і больш загрузім свае перапрацоўчыя магутнасці і забяспечым жывёлагадоўлю».

## АРГАНІЗАЦЫЙНЫ ФАКТАР

Таксама Васіль Ядлоўскі паведаміў, што цяпер практычна завершана сяўба ранніх яравых збожжавых культур. Паводле яго слоў, такая сяўба сёння завершана ў тым ліку і ў Віцебскай вобласці, дзе пераўвільгатненне глебы запавольвала ход палявых работ. «Спачатку ранняя вясна дала нам больш запас часу для палявых работ. Але халоднае надвор'е ў канцы красавіка — пачатку мая разам з багатымі ападкамі, асабліва па паўночным усходзе, прывяло да запаволення тэмпаў пасяўных работ і развіцця культур. Цяпер толькі збіраецца аператыўная інфармацыя аб тым, як пацярпелі яравыя культуры ад вясновых замаразкаў, але мы ўжо ведаем, што гібель яравых культур нязначная. Яшчэ рана казаць пра тое, як паўплываюць вясновыя замаразкі на ўраджай, але мы пакуль не прагназуем істотнага зніжэння аб'ёмаў ураджаю з-за нізкіх тэмператур. Больш за ўсё нас турбуе арганізацыйны фактар, калі не вытрымліваюцца тэмпы палявых работ з прычыны пераўвільгатнення глебы. З-за гэтага адбываюцца самыя вялікія страты», — сказаў Васіль Ядлоўскі.

## ЦВІЦЕННЕ САДОЎ БЕЗ ГУДЗЕННЯ ПЧОЛ

А яшчэ спецыяліст паведаміў, што з-за вясновых замаразкаў пацярпелі пладовыя і ягадныя культуры. «У канцы красавіка — пачатку мая пупышкі сталі пашкоджвацца з-за халадоў. Цвіценне садоў пачалося ў першай дэкадзе мая, але з-за халоднага надвор'я не будзе той прагназаванай ураджайнасці, на якую мы маглі б разлічваць. Пацярпелі і ягадныя культуры — дурніцы, парэчкі і іншыя», — дадаў намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення. Каб у садах і ягадных культурах быў добры ўраджай, пад час цвіцення неабходна сур'ёзная актыўнасць насякомых-апыляльнікаў. А ў халоднае надвор'е пчолы амаль не лятаюць.

Акрамя таго, са спазненнем ідзе развіццё кармавых культур. Касавіцу плануецца пачаць на 5—6 дзён пазней, чым у мінулым годзе.

## ЦЁПЛЫЯ НОЧЫ — НА НАСТУПНЫМ ТЫДНІ

Спрыяльнае для палявых работ надвор'е чакаецца ў другой палове мая, паведаміла **намеснік начальніка Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Святлана КУЗЬМІЧ.**

У найбліжэйшы час сіноптыкі ўвогуле не чакаюць неспрыяльных умоў надвор'я для аграрыяў. Дзённыя тэмпературы складуць больш за 20 градусаў вышэй за нуль. На гэтым тыдні — апошнія начныя замаразкі, а далей начныя тэмпературы будуць павольна павышацца.

Паводле слоў **намесніка начальніка службы гідралогіі і аграметэаралогіі Белгідрамета Надзеі МЕЛЬЧАКОВАЙ,** маштабных пашкоджанняў сельскагаспадарчых культур ад вясновых замаразкаў не адзначана. «Мы часткова турбуемся за азімы рапс, пладовыя дрэвы. З-за халадоў стрымліваліся тэмпы пасадкі бульбы і пасеву кукурузы. Але ў сувязі з павышэннем тэмпературы і ўсталяваннем сонечнага надвор'я ў найбліжэйшы час умовы для гэтых работ будуць спрыяльныя. На гэтым тыдні будзе цёплае сухое надвор'е, аднак магчыма, што ў канцы мая да нас завітаюць дажджы», — адзначыла яна.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*


## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ
ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ НЕДВИЖИМОСТИ

| Наименование продавца (балансодержателя) | № лота | Наименование объекта торгов, краткие характеристики | Местонахождение | Условия продажи | Начальная цена продажи, без учета НДС, BYN | Задаток, BYN |
|---|---|---|---|---|---|---|
| ОАО «Малоритский консервно-овощесушильный комбинат» | 1 | Незавершенный законсервированный цех плодоовощных консервов для детского питания с инв. №103/U-9173, общ. пл. 5047,0 м², расположенный на земельном участке пл. 1,0702 га с кадастровым номером 125250100001002660 | Брестская обл., г. Малорита, ул. Заводская, 9А | с условиями | 23,00 | 1 248,00 |
| | 2 | Капитальное строение (инв. №142/С-10969), общ. пл. 647,2 м² – здание котельной, расположенное на земельном участке пл. 0,3085 га с кадастровым номером 125250100001000205. В состав капитального строения входит забор (ж/б плиты, сетка-рабица, кирпич), протяж. 180 м п. | Брестская обл., г. Малорита, ул. Лермонтова, 16Б | без условий | 18 528,35 | 1 852,84 |
| Организатор торгов | | РУП «Институт недвижимости и оценки» Брестский филиал | | | | |
| Срок заключения договора купли-продажи | | В течение 20 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона | | | | |
| Условия оплаты | | В соответствии с заключенным договором купли-продажи | | | | |
| Номер р/с для перечисления задатка | | 3012178938017 в ОАО «БПС-Сбербанк». Региональная дирекция №100 по Брестской области, код 369, г. Брест, ул. Мицкевича, 10. УНП 201028245 | | | | |

**Аукцион состоится 9 июня 2017 г. в 11.00** по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325 Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»
Сведения о документах, которые необходимо представить для участия в аукционных торгах, и иную информацию можно узнать у организатора аукционных торгов по телефонам: 8 (0162) 20-92-13, 21-88-81, (029) 626-72-52.
Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10, каб. 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00.
Последний день приема заявлений – 8 июня 2017 г. до 17.00

Утерянный полис страховой компании ЗАСО «Промтрансинвест» по добровольному страхованию от болезней и несчастных случаев на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БА 1100291 считать недействительным

## ИЗВЕЩЕНИЕ
УНП 192400611

**Коммунальное унитарное дочернее предприятие «Управление капитального строительства Запад» доводит до сведения заинтересованных лиц о внесении изменений в проектную декларацию о строительстве жилых помещений объекта «Реконструкция застройки территории в районе ул. Михалово, Алибегова. Жилой дом №14 по генплану»,** опубликованную в газете «Звязда» №69 (28179) от 14.04.2016.

Предполагаемый срок ввода жилого дома в эксплуатацию – май 2017 года.

Директор А.А. Угначев

## Извещение о повторном открытом аукционе по продаже права аренды земельного участка для строительства объектов (микрорайон «Ольшанка-2», ул. Болдина) в городе Гродно 13 июня 2017 года

| № лота | Наименование объекта | Местонахождение объекта | Площадь земельного участка (га) | Кадастровый номер | Начальная цена (руб.) | Сумма задатка (руб.) | Ориентировочная сумма расходов по подготовке земельно-кадастровой документации (руб.) | Условие продажи и целевое назначение земельного участка |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Право аренды земельного участка сроком на 50 лет | Перекресток улицы Болдина и «Тропы здоровья» | 0,2102 | 440100000002002102 | 126 957,43 | 12 000 | 3 020,6 | Строительство объекта общественного питания (с открытой террасой) – кафе на 30-50 мест |
| 2* | Право аренды земельного участка сроком на 50 лет | Микрорайон «Южный-2» («Ольшанка-2») поз. по генплану №105 | 0,7866 | 440100000001008878 | 153 831, 55 | 15 000,0 | 3 020, 6 | Строительство торгового объекта с объектом общественного питания |

* - возможно изменение целевого назначения земельного участка с внесением изменений в градостроительный паспорт объекта в соответствии с решением Гродненского городского исполнительного комитета от 09.03.2017 г. № 132 «Об определении Перечня земельных участков для разработки градостроительных паспортов и внесении изменений в решения Гродненского городского исполнительного комитета».

Победитель аукциона обязан:

в установленном порядке получить разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и разработать строительный проект на строительство объекта в срок, не превышающий 1 года;

приступить к занятию земельного участка в соответствии с целями и условиями его предоставления не позднее 6 месяцев со дня утверждения проектной документации юридическому лицу, индивидуальному предпринимателю, 1 года - гражданину;

осуществить строительство объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией.

В случае нарушения сроков проектирования и строительства в договоре аренды будут предусмотрены штрафные санкции.

Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости».

При оформлении заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, представляет:

1. Копии платежных поручений о внесении **задатка** за подачу заявления на расчетный счет 3012000041810 в филиале № 400 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», код 152101752, УНП 590727594, получатель – КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», с отметкой банка-отправителя об их исполнении. **Юридическое лицо:** доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов. **Физическое лицо**: паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.

2. Платеж за право заключения договора аренды земельных участков осуществляется в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона.

3. Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона возместить организатору аукциона затраты, связанные с организацией и проведением аукциона, а также расходы по подготовке земельно-кадастровой документации, возместить отделу коммунального имущества и приватизации Гродненского горисполкома расходы по подготовке документации для проведения аукциона.

4. Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с объектом.

**Аукцион состоится 13 июня 2017 года в 12.00 в здании горисполкома по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1**.

Заявления на участие в аукционах принимаются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет № 57, в рабочие дни **с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 с 15 мая по 7 июня 2017 года**. Телефоны для справок в Гродно: **(0152) 72-05-37, 72-05-46**. Адрес сайта: **www.grodno.gov.by**

# ФІЛЬТРуйце прапановы



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Пытанне гэта не надта моцна хвалявала Антаніну Мікалаеўну, але чаму б не паслухаць дасведчаных людзей? Можа нешта новае скажуць... Новае на сходзе сапраўды прагучала з вуснаў прадстаўнікоў адной фірмы, якая займаецца распаўсюджваннем фільтраў для вады. Менавіта яны, як аказалася потым, ініцыявалі гэты сход. І гаварылі толькі яны. Дакладней, палохалі пенсіянераў дрэннай якасцю вадаправоднай вады, якая, акрамя таго, мае тэндэнцыю пагаршацца. Тут, маўляў, адно выйсце: паставіць фільтр. І такім чынам стварыць надзейную заслону дрэнным, а то і ўвогуле небяспечным рэчывам, якіх шмат у вадзе з-пад крана. А паколькі прадстаўнікі ЖЭСа і «Водаканала» адсутнічалі (іх, як потым высветлілася, і не думалі запрашаць), то палёт фантазіі прадстаўнікоў фірмы быў на высокім узроўні: маўляў, да поўнага шчасця толькі гэтага фільтра вам і не хапае.

У якасці галоўнай прыманкі выкарысталі велізарную 50-працэнтную зніжку для інвалідаў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны і шматдзетных маці. Тут Антаніна Мікалаеўна сказала: «А мы з мужам абодва інваліды: муж першай групы, інсультнік, а я — другой». У адказ: «Вам пашанцавала. Вось вам у першую чаргу паставім фільтр. Толькі трэба вашы дакументы аб інваліднасці паглядзець». Пакуль гарталі дакументы, нешта перапісвалі, сантэхнік з фірмы хутка, літаральна за 10 хвілін, прыстасаваў на кухні пад мойкай фільтр. З чым пенсіянераў-інвалідаў госці сардэчна павіншавалі.

Потым Антаніна Мікалаеўна ўспамінала, што яны быццам замбіравалі яе: літаральна забалбаталі, далі падпісаць нейкія паперы. Крыху, праўда, пахмурнелі, калі даведаліся, што ў новых шчаслівых уладальнікаў фільтра няма пры сабе наяўных грошай — толькі банкаўская картка. Жанчыну нават усадзілі на аўтамабілі падвезці да найбліжэйшага аддзялення Беларусбанка, але яна на той момант не змагла пакінуць хворага мужа аднаго. Праўда, прадстаўнікі фірмы моцна і не настойвалі: дагавор падпісаны, значыць, заплаціць. Куды дзенуцца. На тым і развіталіся.

Антаніна Мікалаеўна адразу патэлефанавала дачцэ і пахвалілася фільтрам: маўляў, пашанцавала, з вялікай зніжкай набыла. Тая адчула нешта падазронае ў дзеяннях фірмы і параіла маці не спяшацца з аплатай, пакуль яна сама не ўбачыць і фільтр, і дагавор. Маці павінна была, згодна з дагаворам, заплаціць 320 рублёў. Прычым, у ім не ўказвалася асобна цана фільтра і кошт устаноўкі.

Дачка ўважліва вывучыла ўсе абставіны гэтага пытання і прыйшла да высновы: яе бацькоў банальна развялі на грошы. Бо аналагічны па вартасцях фільтр можна было набыць у Мінску за суму ад 80 да 120 рублёў — і без усялякіх «зніжак». Няўжо 10-мінутная паслуга па яго мантажы каштуе 200 рублёў? Аказалася, што на самай справе аніякай зніжкі і не было: выключна маніпуляцыя лічбамі. Каб разысціся з мірам, дачка прапанавала фірме забраць фільтр, бо аплаты не будзе. Адказ быў катэгарычны: дагавор падпісаны, плаціце, інакш «сустрэнемся ў судзе».

Праз пэўны час з суда Маскоўскага раёна Антаніне Мікалаеўне прыйшла папера, згодна з якой неабходна было адказваць на іск фірмы. Трэба сказаць, што да разгляду справы дачка, якая ўзяла на сабе судовыя клопаты маці, грунтоўна падрыхтавалася. Вывучыла адпаведныя законы і інструкцыі, «залезла» ў інтэрнэт, дзе знайшла братоў-саюзнікаў па няшчасці — таксама пацярпелых ад агрэсіўнай палітыкі гэтай фірмы. Адзін небарака, маці якога таксама прадалі аналагічны фільтр, праверыў яго на якасць ачысткі вады. Яна толькі трохі памякчэла, а вось астатнія характарыстыкі не змяніліся. Шмат карыснага дачка даведалася ў таварыстве абароны спажыўцоў, дзе на азначаную фірму было ўжо складзена цэлае «дасье». Звярнулася ў «Водаканал» і ЖЭС, дзе высветліла асобныя цікавыя моманты.

Не будзем падрабязна пераказваць усе перыпетыі судовай справы, скажам толькі, што фірма суд не выйграла. Праўда, Антаніне Мікалаеўне давялося падаваць сустрэчны судовы іск. Але здзерці грошы з пенсіянераў фірме не ўдалося.

Якія высновы можна зрабіць з гэтай справы?

Першае і галоўнае: не верце на словы красамоўным і абаяльным прадстаўнікам розных, часам з мудрагелістай назвай, камерцыйных структур, якія нечакана з'яўляюцца на парозе вашага дома. У іх адна задача: прадаць свой тавар. Тут усё ідзе ў ход, але акцэнт робіцца на быццам бы рэкордныя зніжкі ў параўнанні з іншымі прадаўцамі аналагічных вырабаў. Таму не пагаджайцеся адразу на «выгадную паслугу», параіцеся са сваякамі, сябрамі, знаёмымі, пашукайце такія вырабы ў інтэрнэце, параўнайце цэны.

Па-другое, не давайце пашпарт незнаёмцам для перапісвання вашых асабістых даных у нейкі там дагавор. Вы ж у краме набываеце тавары без пашпарта, адзіная сувязь пасля гэтага з прадаўцом — чэк. Без яго немагчыма вярнуць тавар назад у належны тэрмін. А паперка з вашым подпісам потым аказваецца сур'ёзным дакументам супраць вас: а менавіта дагаворам падраду аб аказанні вам паслуг па ўстаноўцы, як у нашым выпадку, фільтра.

Па-трэцяе, калі вас угаварылі падпісаць нейкі дакумент і вы нават заплацілі, то гэта не значыць, што ўсё страчана. Ёсць служба па ахове правоў спажыўцоў, юрыдычныя кансультацыі, а значыць, і шанц вярнуць грошы. Не такія ўжо яны мудрыя, гэтыя махляры, каб усё прадугледзець.

**Леанід ЛАХМАНЕНКА.**

## Ахвотных нас падмануць не становіцца менш

А летась, напрыклад, у «модзе» быў рамонт пластыкавых вокнаў. Сталым людзям звычайна тэлефанавала ветлівая дзяўчына і з радасцю паведамляла, што на гэтым тыдні ў іх доме ці квартале праводзіцца акцыя па рамонце вокнаў, а пенсіянерам прадугледжаны значныя зніжкі. Калі вы не супраць, то вас наведае іх прадстаўнік, які, на шчасце, сёння працуе побач з вашым домам. Ён ацэніць стан вокнаў, дасць парады, нешта падкажа... Паслуга бясплатная. Звычайна людзі пагаджаліся. Хутка прыходзіў чыста апрануты і культурны малады чалавек са сваімі бахіламі (каб выпадкова не запэцкаць вашу падлогу) і ўважліва аглядаў вокны, знаходзіў нямала схаваных дэфектаў і прыкмет амаль 100-працэнтнай зношанасці ваконных механізмаў (фурнітуры), якія праз пэўны час зламаюцца, і тады прыйдзецца ставіць новае акно. Эксперт вытрымліваў паўзу, а затым з сур'ёзным выглядам прапаноўваў рамонт з істотнай зніжкай. Сталыя людзі нярэдка пагаджаліся, падпісвалі тут жа дагавор. А потым даведваліся, што іх «развялі», бо рамонт трох вокнаў каштаваў, як адно новае.

Ёсць катэгорыя дзялкоў, якія, наадварот, гатовыя пазбавіць вас ад клопатаў, аказаць паслугу, нават нешта заплаціць. Сёння ў часткі насельніцтва стала шмат залішніх кніг. Няма ўжо былой прагі да літаратуры. Чытаюць менш, людзі часам не ведаюць, куды дзець старыя выданні. Выкінуць шкада, аддалі б каму-небудзь, ды мала хто бярэ. І тут з'яўляюцца скупшчыкі кніжак, якія ў бясплатных рэкламных выданнях размяшчаюць аб'явы накшталт «Куплю кнігі». Яны сапраўды за невялікія грошы набываюць асобныя выданні. Кажуць, што для сябе, але часцей дзеля перапродажу. Аднак пад іх маркай нярэдка ў кватэрах мінчан, жыхароў іншых гарадоў з'яўляюцца паляўнічыя за рарытэтамі. Яны быццам бы з інтарэсам глядзяць кнігі вашай бібліятэкі, нешта адкладаюць у бок, спрачаюцца вакол цаны. Аднак больш за ўсё іх цікавяць рэдкія, пераважна дарэвалюцыйныя, выданні або выданні савецкага перыяду звычайна да 1930 года.

Калі рарытэтаў няма, то госць нейк спакваля пераводзіць размову на наяўнасць у доме старажытных рэчаў, манет, упрыгожванняў, паштовак, статуэтак, баявых узнагарод, ваеннай формы (асабліва ў пашане генеральская), прадметаў сталінскай эпохі і г. д. І часам шанцуе: недасведчаны чалавек можа прадаць за зусім невялікія грошы рэдкую рэч, за якую ў заўзятага калекцыянера можна «наварыць» у шмат разоў больш. Таму будзьце пільныя.


# РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»

**извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МСПМК» на праве собственности**

| № лота | Описание | Начальная цена с учетом НДС, бел. руб. | Задаток, бел. руб | Шаг аукциона |
|---|---|---|---|---|
| **Лот №1** | 1. Административное помещение с инв. №630/D-29753, площадь – 126,1 м$^2$, этаж – 1. 2. Склад с инв. №630/D-44779, площадь – 224,3 м$^2$, этаж – 1. Адрес: г. Молодечно, ул. Тамары Дудко, 12-2, 12/1-2 | 170 908,70 | 8 545,44 | 5% |
| **Лот №2** | 1. Проходная с инв. №630/С-48774, 1998 г. п. Литер – А1/к, площадь – 13,3 м$^2$, количество надземных этажей – 1. Конструктивные элементы – 3 ограждения, метал. калитка, метал. ворота. – 2 шт. 2. Закрытая автостоянка со вспомогательно-бытовыми помещениями с инв. №630/С-48768. Площадь – 495,2 м$^2$. 3. Эстакада с инв. №1100. Адрес: г. Молодечно, ул. Тамары Дудко, 12/2, 12/3 | 297 354,62 | 14 867,73 | 5% |
| **Лот №3** | GAZ 3110 кузов (рама) №31100010464738 / ХТН31100011060187, 2001 г. в. Тип ТС – легковой седан. Разрешенная масса – 1790 кг. Цвет – белый. Двигатель – с рабочим объемом 2445 см$^3$, бензин ЗМЗ 402. КП – механическая. Пробег на 03.05.2017 – 505708 км. Неисправен насос системы охлаждения. Адрес: г. Молодечно, ул. Тамары Дудко, 12 | 1 300,80 | 65,04 | 65,04 бел. руб. |
| **Лот №4** | VOLKSWAGEN PASSAT кузов (рама) №WVWZZZ31ZNB153755, 1992 г. в. Тип ТС – легковой специальный седан. Разрешенная масса – 1680 кг. Цвет – белый. Двигатель – с рабочим объемом 1800 см$^3$, бензин. КП – механическая. Пробег на 03.05.2017 – 423740 км. Адрес: г. Молодечно, ул. Тамары Дудко, 12 | 2 113,20 | 105,66 | 105,66 бел. руб. |
| **Лот №5** | VOLKSWAGEN TRANSPORTER кузов (рама) №WV2ZZZ70ZRH049556, 1994 г. в. Тип ТС – легковой специальный вагон. Разрешенная масса – 2515 кг. Цвет – синий. Двигатель – с рабочим объемом 1900 см$^3$, дизель. КП – механическая. Пробег на 03.05.2017 – 716212 км. Адрес: г. Молодечно, ул. Тамары Дудко, 12 | 6 034,80 | 301,74 | 301,74 бел. руб. |
| **Лот №6** | UAZ 39621 кузов (рама) №390900А0208115. Тип ТС – грузопассажирский вагон. Разрешенная масса – 2720 кг. Масса без нагрузки – 1800 кг. Цвет – темно-зеленый. Двигатель – с рабочим объемом 2445 см$^3$, бензин, УМЗ 417.10. КП – механическая. Пробег на 03.05.2017 – 92060 км. Адрес: г. Молодечно, ул. Тамары Дудко, 12 | 5 274,00 | 263,70 | 263,70 бел. руб. |
| **Лот №7** | GAZ-SAZ-350701 кузов (рама) №33070050078182 / 33072050874587, 2005 г. в. Тип ТС – грузовой специальный самосвал. Разрешенная масса – 8000 кг. Масса без нагрузки – 3600 кг. Цвет – белый. Двигатель – с рабочим объемом 4254 куб. см, бензин, ЗМЗ 51100А. КП – механическая. Пробег на 03.05.2017 – 161400 км. Адрес: г. Молодечно, ул. Тамары Дудко, 12 | 6 962,40 | 348,12 | 348,12 бел. руб. |
| **Лот №8** | MAZ 5337 А2-340 кузов (рама) №Y39PMC328A2008108 / Y3M5337A2A0003514, 2010 г. в. Тип ТС – грузовой специальный подъемник гидравлический. Разрешенная масса – 16000 кг. Масса без нагрузки – 15700 кг. Цвет – бело-желтый. Двигатель – с рабочим объемом 11150 куб. см, дизель, ЯМЗ 6563.10. КП – механическая. Пробег на 03.05.2017 – 50155 км. Адрес: г. Молодечно, ул. Тамары Дудко, 12 | 63 703,20 | 3 185,16 | 3 185,16 бел. руб. |
| **Лот №9** | Погрузчик ТО-18Б, 1993 г. в. Заводской номер машины (шасси) – 620. Двигатель: марка и заводской №А-01М 1671603. Цвет – желтый. Двигатель – с рабочим объемом 11150 см$^3$, дизель, КП – механическая. Адрес: г. Молодечно, ул. Тамары Дудко, 12 | 9 007,20 | 450,36 | 450,36 бел. руб. |
| **Лот №10** | Экскаватор ЭО-2621, 1987 г. в. Заводской №машины (шасси) – 142592. Двигатель: марка и заводской №2-65 №б/н. Двигатель – с рабочим объемом 4940 куб. см, дизель, Д65-Н. КП – механическая. Экскаватор. 730 м/ч, нет стекла. Адрес: г. Молодечно, ул. Тамары Дудко, 12 | 3 594,00 | 179,70 | 179,70 бел. руб. |
| **Лот №11** | Штукатурная станция ШС4/6 с инв. №1091. Адрес: г. Молодечно, ул. Тамары Дудко, 12 | 6 558,00 | 327,90 | 327,90 бел. руб. |
| **Лот №12** | Блок-контейнер 8х2,45 с инв. №01080. Адрес: г. Молодечно, ул. Тамары Дудко, 12 | 1 533,60 | 76,68 | 76,68 бел. руб. |
| **Лот №13** | Бытовка строительная БК-3 6000х2440х2500 с инв. №01078. Адрес: г. Молодечно, ул. Тамары Дудко, 12 | 1 149,60 | 57,48 | 57,48 бел. руб. |
| **Лот №14** | Бытовка с инв. №01050. . Адрес: Молодечно, ул. Тамары Дудко, 12 | 1 149,60 | 57,48 | 57,48 бел. руб. |
| **Лот №15** | Вагон-бытовка на колесах с инв. №1093. Адрес: Молодечно, ул. Тамары Дудко, 12 | 2 149,20 | 107,46 | 107,46 бел. руб. |
| **Лот №16** | Вагон-бытовка на колесах с инв. №1005. Адрес: Молодечно, ул. Тамары Дудко, 12 | 2 149,20 | 107,46 | 107,46 бел. руб. |
| **Лот №17** | Вагон-бытовка на колесах с инв. №01068. Адрес: Молодечно, ул. Тамары Дудко, 12 | 2 149,20 | 107,46 | 107,46 бел. руб. |
| **Лот №18** | Вагон-дом на колесах с инв. №1009. Адрес: Молодечно, ул. Тамары Дудко, 12 | 2 149,20 | 107,46 | 107,46 бел. руб. |

ЗЕМЕЛЬНЫЙ УЧАСТОК

Лот №2. Капитальные строения с инв. №630/С-48774, 630/С-48768 расположены на земельном участке площадью 0,4928 га с кадастровым №623850100003001942. Целевое назначение земельного участка: земельный участок для обслуживания зданий и сооружений. Право постоянного пользования. Доля: 1/2. Примечания: собственность РБ. На земельном участке расположены иные объекты, которые не выставляются на аукцион. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

УСЛОВИЯ

1. Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов), – Претендент на покупку должен подписать с Продавцом договор купли-продажи Объекта (Объектов) в течение 10 (десяти) календарных дней с назначенной даты проведения аукциона.
2. Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен оплатить стоимость приобретенного на аукционе Объекта (Объектов) в течение 30 (тридцати) календарных дней с назначенной даты проведения аукциона.
3. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 5 (пяти) банковских дней с назначенной даты проведения аукциона.
4. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.

**Аукцион состоится 19.06.2017 в 11.00 по адресу:**
**г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.**

Продавец: ОАО «МСПМК» 222310 г. Молодечно, ул. Тамары Дудко, д. 12, тел./факс (0176) 74-39-00.

Организатор аукциона: РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, пом. 9, каб. 6, тел. 8 (017) 306-00-57.

Порядок оформления участия в аукционе и перечень документов, прилагаемых к заявлению на участие в торгах содержится на сайте Организатора аукциона ino.by. Заявления на участие и необходимые документы принимаются с 17.05.2017 г. в рабочие дни с 8.30 до 12.30, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений 15.06.2017 в 11.00.

Задаток перечисляется на р/с 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк», 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества (Лот №__), принадлежащего ОАО «МСПМК», проводимом 19 июня 2017 г. Организатор торгов вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за три дня до наступления даты его проведения.

Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм Положения о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденного Постановлением Совета Министров Республики Беларусь 08.01.2013 №16, и Положения об организации и проведении аукционов.

Участник, желающий участвовать в аукционе в отношении нескольких лотов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из лотов. Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектами. Контактные лица для осмотра Объектов, тел.: (0176) 74-39-00, 8 (029) 165-06-51.

**Контактная информация организатора аукциона:**
**8 (017) 306-00-57 | 8(029) 356-90-03 | 8(029) 550-09-52 | torgi@ino.by**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

17 мая 2017 г.
№17 (401)



стар. 2

**Самы складаны закон**



стар. 7

**Будні вясковага доктара**



стар. 8

**Ці лёгка стаць лепшым?**

ГАЛОЎНАЯ ТЭМА

# ЯК ЖЫВЕЦЦА ФАПу?

## Рост насельніцтва ў гарадах і змяншэнне яго ў сельскай мясцовасці працягваецца, аднак даступнасць меддапамогі застаецца аднолькавай



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Як вядома, у краіне дзейнічае тэрытарыяльны прынцып абслугоўвання — усе мы замацаваны за ўрачамі пярвічнага звяна. Дарэчы, гэта 2193 участковыя педыятры, 952 урачы агульнай практыкі і 3889 участковых тэрапеўтаў. Паводле дзяржаўнага сацыяльнага стандарту, за ўрачом агульнай практыкі павінна быць замацавана 1300 чалавек, за ўчастковым тэрапеўтам — 1700, а за ўчастковым педыятрам — 800 дзяцей.**

стар. 3

КРУГЛЫ СТОЛ

# УМЕЦЬ СЛУХАЦЬ І ЧУЦЬ

## Якія захады патрэбны для павышэння ролі мясцовага самакіравання?




Фота Надзеі БУЖАН

**На жаль, далёка не ўсе выбаршчыкі ведаюць свайго дэпутата. Ужо гутарка не ідзе пра тое, ці цікавіцца насельніцтва, асабліва ў вялікіх гарадах, пытаннямі, якія вырашаюць мясцовыя ўлады... Як зрабіць прадстаўнікоў саветаў дэпутатаў больш пазнавальнымі, а іх працу больш эфектыўнай, — пра гэта ішла размова падчас круглага стала «Роля мясцовага самакіравання ў грамадскім і сацыяльна-эканамічным жыцці рэгіёнаў і краіны ў цэлым».**

У мерапрыемстве ўзялі ўдзел Лілія АНАНІЧ, міністр інфармацыі Беларусі, Аляксандр ПАПКОЎ, старшыня Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу, Леанід ЦУПРЫК, старшыня Пастаяннай камісіі па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ, намеснік міністра інфармацыі, Павел СУХАРУКАЎ, дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда», Аляксандр ІВАНОЎСКІ, прафесар-кансультант Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, Іван ЛІПНІЦКІ, старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў, Ігар ЖУК, старшыня Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў, Георгій АТАМАНАЎ, старшыня Пастаяннай камісіі Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў мандатнай, па галоснасці, самакіраванні, правапарадку і міжнародных сувязях, Віктар РАЖАНЕЦ, старшыня Слуцкага раённага Савета дэпутатаў, Наталля СУШКО, старшыня Жодзінскага гарадскога Савета дэпутатаў, Жанна ВАРАБЕЙ, старшыня Бараўлянскага сельскага Савета дэпутатаў, Вольга ШПІЛЕЎСКАЯ, галоўны рэдактар газеты «Мінская праўда», Тамара ВЯЦКАЯ, дырэктар радыёстанцыі «Мінская хваля», Вадзім ШЧАГЛОЎ, галоўны рэдактар газеты «Бабруйскае жыццё».

стар. 4–5

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



# Больш інвестыцый

## *Будучыня за сумеснымі беларуска-расійскімі прадпрыемствамі*

**Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Міхаіл МЯСНІКОВІЧ на сустрэчы з дэлегацыяй Растоўскай вобласці прапанаваў развіваць не толькі гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва, але і рабіць стаўку на больш прасунутыя формы інтэграцыі.**



Міхаіл Мясніковіч адзначыў, што ва ўмовах адкрытых эканомік існуюць фактары, не залежныя ад нашых краін, якія ўплываюць на гандаль. Каб выходзіць на больш стабільнае ўзаемадзеянне і станавіцца партнёрамі, трэба адкрываць сумесныя беларуска-расійскія кампаніі. «Безумоўна, інвестыцыйная дзейнасць — у гэтым будучыня».

Па выніках сустрэчы старшыня Савета Рэспублікі разам са **старшынёй Заканадаўчага сходу Растоўскай вобласці Аляксандрам ІШЧАНКАМ** падпісалі сумесную заяву аб супрацоўніцтве паміж Саветам Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі і Заканадаўчым Сходам Растоўскай вобласці Расіі. «Дэпутацкае братэрства стварае добрую падтрымку для таго, каб рашэнні, якія выпрацаваны на вышэйшым, на высоком узроўнях, рэалізоўваліся», — адзначыў Міхаіл Мясніковіч.

Іншы перспектыўны кірунак супрацоўніцтва — навуковая сфера. Старшыня Савета Рэспублікі прапанаваў разглядзець магчымасць удзелу расійскіх навукоўцаў у праграмах і праектах Беларусі на роўных умовах. І наадварот. Цяпер «бюджэтны рубель не мае права перасякаць мяжу». Але калі мы гаворым пра тое, што расіяне нам не іншаземцы, то можна разгледзець іх допуск да конкурсу на ўдзел у бюджэтных праграмах. Сінергетычны эфект ад такога супрацоўніцтва будзе нашмат большы.

**Надзея АНІСОВІЧ.** *anisovich@zviazda.by*

# Чакаем гасцей

## *У маі ў Мінск завітаюць прадстаўнікі структуры Усходняга партнёрства*

**У Савеце Рэспублікі пад кіраўніцтвам старшыні Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Аляксандра ПАПКОВА адбылася нарада па падрыхтоўцы візіту ў Беларусь прадстаўнікоў Канферэнцыі рэгіянальных і мясцовых органаў улады Усходняга партнёрства (CORLEAP).**

У ходзе мерапрыемства былі разгледжаны пытанні правядзення ў Мінску ў бягучым месяцы пасяджэння бюро CORLEAP. У нарадзе прынялі ўдзел прадстаўнікі міністэрстваў працы і сацыяльнай абароны, спорту і турызму, фінансаў, замежных спраў, эканомікі.

# Людзі людзям патрэбныя

## *Члены Савета Рэспублікі правялі сустрэчы і прамыя лініі з грамадзянамі*

**Апошнім часам сенатары правялі шэраг сустрэч з выбаршчыкамі. Традыцыйна грамадзян хвалявалі пытанні бытавога плану — ад цэн на бульбу да жыллёвых пытанняў.**

**Аксана КАВАЛЬКОВА, член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, дырэктар сярэдняй школы №16 Мазыра**, правяла асабісты прыём грамадзян Мазырскага раёна. Выбаршчыкі звярталіся па пытаннях прававога рэгулявання жыллёвых адносін, жыллёва-камунальных паслуг. Прамую лінію з жыхарамі Мастоўскага, Шчучынскага і Ваўкавыскага раёнаў правёў **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах, старшыня Ваўкавыскага райвыканкама Міхаіл СІЦЬКО**. Людзей цікавілі пытанні добраўпарадкавання дваровых тэрыторый, дзіцячых пляцовак, грэйдзіравання дарог і вуліц, цэн на бульбу, малако і хлеб, працаўладкавання, жыллёвага заканадаўства, страхавога і працоўнага стажу, ачысткі вады.

**Юрый ДЗЯРКАЧ, член Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, начальнік упраўлення аховы здароўя Віцебскага аблвыканкама**, правёў прамую лінію з насельніцтвам рэгіёна, падчас якой удзімаліся пытанні ўдасканалення сацыяльнай інфраструктуры вобласці, медыцынскага абслугоўвання. **Ірына СТАРАВОЙТАВА, старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці**, правяла асабісты прыём грамадзян, падчас якога былі ўзняты пытанні аб аўтарскім праве і сумежных правах.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

ПАРЛАМЕНЦКІ ДЗЁННІК



# «Самы складаны закон»

**Так выказваюцца пра законапраект «Аб абыходжанні з жывёламі» некаторыя дэпутаты. Гэты дакумент не ўдаецца прыняць ужо шмат гадоў з-за няўзгодненасці паміж дэпутатамі, якія курыруюць дакумент, і грамадскасцю, якую многія палажэнні не задавальняюць. Парламентарыі імкнуцца азнаёміцца з рознымі пунктамі гледжання па праблеме, таму чарговае выязное пасяджэнне Пастаяннай камісіі Палаты Прадстаўнікоў па жыллёвай палітыцы і будаўніцтве, якая працуе над законапраектам, адбылося на базе дзяржаўнага прадпрыемства «Фаўна горада» ў Мінску.**

### НЕЗВЫЧАЙНЫЯ ПАСТАЯЛЬЦЫ

— Мы пачалі працаваць з ліпеня мінулага года, — расказвае **дырэктар арганізацыі Тамара ЦАРЫКОЎСКАЯ**. — І на сённяшні дзень мы — першая дзяржаўная гасцініца для жывёл. Нават у Расіі такіх няма.

Гасцініца можа прыняць 72 «пастаяльцы». Жывёліну можна пакінуць не толькі на суткі і больш, але і на пэўны дзённы час — дырэктар называе такую паслугу «дзіцячы сад».

Нягледзячы на тое, што прадпрыемства зарабляе грошы менавіта часовым утрыманнем жывёл, Тамара Уладзіміраўна настойвае на тым, што надоўга пакідаць свайго гадаванца непажадана. «Калі сабака сумуе і скуголіць, то ў яго могуць развіцца адмоўныя якасці», — тлумачыць дырэктар. Дарэчы, пакуль найбольш частыя госці «Фаўны» — кошкі і сабакі, а нядаўна ў гасцініцу ўпершыню прыехаў тхор.

— Ва ўсіх жывёл, якія трапляюць да нас, ёсць пашпарт. Калі пры паступленні ён адсутнічае, то мы заводзім яго на месцы. І я выключна станоўча стаўлюся да чыпавання, — падкрэслівае Тамара Царыкоўская. — Наогул, лічу, што сёння ўлік жывёл — гэта самае правільнае пытанне.

### ЧАГО ЧАКАЦЬ?

Законапраект «Аб абыходжанні з жывёламі» спрабуюць прыняць ужо больш за 15 гадоў, аднак пакуль далей абмеркавання справа не прасунулася.

На думку абаронцаў жывёл і грамадскасці дакумент практычна не датычыцца беспрытульных жывёл, а таксама значна абмяжоўвае дзеянні валанцёраў. **Старшыня Пастаяннай камісіі па заканадаўстве Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Наталля ГУЙВІК** лічыць, што няслушныя спрэчкі шкодзяць усім:

— Абаронцы жывёл не разумеюць, што пакуль у нашай прававой дзяржаве не будзе нормы ў выглядзе пэўнага нарматыўна-прававога акта, мы не ссунемся з месца. Хай дакумент з'явіцца ў тым выглядзе, які ёсць цяпер, таму што яго неабходна апрабаваць на практыцы. І калі ў ім будуць пэўныя прабелы, то мы дапрацуем яго.

Па словах дэпутата, гэты законапраект з'яўляецца самым складаным у яе практыцы.

— Не магу зразумець абаронцаў жывёл — яны хочуць, каб мы раўняліся на Еўропу, але ў нас няма такіх казачных грошай.

Што датычыцца канкрэтных палажэнняў законапраекта, то дэпутаты падтрымліваюць чыпаванне толькі самых небяспечных парод, тады як абаронцы жывёл настойваюць на ўсеагульнай працэдуры для ўсіх жывёл. «Пакуль не плануецца чыпаванне ўсіх жывёл, мы павінны апрабаваць гэтую норму на сабаках пэўных парод», — лічыць **старшыня Пастаяннай камісіі па жыллёвай палітыцы і будаўніцтве Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Юрый ДАРАГАКУПЕЦ**. Парламентарый падкрэслівае: у рэальнай эканамічнай сітуацыі трэба цвяроза ацэньваць свае магчымасці.

Акрамя таго, паводле новага закона, уладальнікам нельга будзе трымаць у кватэры больш чым дзве жывёлы, калі гаворка ідзе пра сабак і катоў. «Гэта самая прымальная колькасць», — кажа Наталля Гуйвік.

### ЗНАЙСЦІ КАНСЭНСУС

Прытулкі для кінутых чатырохногіх — гэта яшчэ адно няпростае пытанне ў рамках законапраекта. Абаронцы жывёл настойваюць на стварэнні большай колькасці прытулкаў, тады як парламентарыі звяртаюць увагу на тое, што ў заходніх краінах яны прыватныя. Нялёгка растлумачыць людзям, чаму на бюджэтныя грошы пабудавалі прытулак для жывёл, а не новы дзіцячы сад.

Па словах Наталлі Гуйвік, для бяздомных жывёл, якія трапляюць у прытулак, будзе прадугледжана стэрылізацыя. Гэта таксама выклікае пытанні ў апанентаў.

Словам, пакуль застаецца шмат няўзгодненых момантаў, аднак у сумеснай рабоце дэпутаты, абаронцы жывёл і грамадскасць шукаюць кансэнсус. Праект закона «Аб абыходжанні з жывёламі» плануецца прыняць у першым чытанні ўжо падчас вясновай сесіі Палаты прадстаўнікоў.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.** *lukashevich@zviazda.by*

САЦЫЯЛЬНАЯ АДКАЗНАСЦЬ

# БЛІЖЭЙ ДА БЕЛАРУСКАГА

## Чаму півавары падаліся... ў гісторыю?

**Для аматараў пісаць без памылак ёсць добрая навіна: на свяце горада ў Мінску за пісьменнасць можна будзе атрымаць матэрыяльны прыз. Прынамсі, арганізацыя і правядзенне «Агульнай дыктоўкі» у якасці падарунка да гістарычнага і культурнага свята падаліся кіраўніцтву ААТ «Лідскае піва» добрай ідэяй.**

Па словах генеральнага дырэктара прадпрыемства літоўца Аўдрыуса Мікшыса, у двух суседніх народаў многа агульнага ў звычаях і менталітэце, ды і беларуская культура з гісторыяй аказаліся цікавымі для даследаванняў. Вось таму прадпрыемства на пару з гарадскімі ўладамі і арганізуе культурныя мерапрыемствы ды экскурсы ў гісторыю. Не так даўно ў планах піваварў з'явіўся яшчэ адзін пункт — карпаратыўны пераход на беларускую мову.

— 2017 год — добры час для аднаўлення цікавасці да ўласных вытокаў. Наперадзе шмат знамянальных дат — гэта і 950 гадоў Мінску, і 800-годдзе этноніма «Беларусь», ужо поўным ходам ідуць мерапрыемствы да ўшанавання 500-годдзя беларускага кнігадрукавання. Але ёсць і трывожныя моманты. Так, эксперты ЮНЕСКА далі беларускай мове статус «уразлівай». Таму сацыяльна значныя праекты з нацыянальным адценнем будуць як ніколі дарэчы, — заўважыла **менеджар па карпаратыўных камунікацыях Наталля ЯФІМКІНА**.

У сацыяльнай дзейнасці і пры планаванні карпаратыўнай сацыяльнай адказнасці гісторыка-даследчым праектам удзяляецца асаблівая ўвага. Канешне, спецыфіка кампаніі вымагае прыярытэтнага вывучэння бровараства. Заканамернае пытанне: як даволі вузкая тэма можа дапамагчы культурнаму развіццю горада?

— Набыць статус беларускай сталіцы піваварэння для Ліды вельмі прэстыжна, — лічыць **Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ, кандыдат гістарычных навук, дырэктар Інстытута гісторыі НАН Беларусі.** — Гэта дапаможа прыцягнуць турыстычныя патокі.

Штогадовы фестываль хмелю, соладу і вады плануецца правесці ў Лідзе трэці раз. Гэта, як заўважае дырэктар кампаніі, добры прыклад супадзення поглядаў кіраўніцтва прадпрыемства і мясцовых улад. У выніку атрымліваецца даволі разнастайны дзень горада з канцэртамі папулярных гуртоў на адкрытым паветры, конкурсамі і цікавымі тэатралізаванымі дзействамі, экскурсіямі па гістарычных мясцінах. Аўдрыус Мікшыс расказвае, што ў мінулыя гады сярод наведвальнікаў Lidbeer былі заўважаны госці з іншых краін, што можна расцаніць як добры знак.

— Акрамя культурнага боку, стараемся падтрымліваць спартыўныя мерапрыемствы, мясцовую ўстанову медыцыны, адукацыю і творчасць. Дабрачыннасць цяпер вельмі важная для любой еўрапейскай кампаніі, — заўважае кіраўнік прадпрыемства. — Ужо шэсць гадоў адораныя вучні з Лідчыны атрымліваюць падарункі за сваю працу, а лепшыя педагогі — за свае заслугі. Гэтыя мерапрыемствы мы ладзім разам з Гродзенскім абласным і Лідскім раённым выканкамамі, а таксама аддзелам адукацыі і культуры. Звяртаем увагу на дзяцей з няпоўных, шматдзетных сямей, на тых, хто трапляе ў складанае становішча.

...Побач з будынкам завода размешчаны прыпынак для веласіпедаў. Гэта так званы агульны транспарт, кожны супрацоўнік кампаніі можа бясплатна ўзяць двухколавую замену аўтамабілю і выехаць па справах. Магчыма, такая ўвага да экалагічнага перамяшчэння паспрые большаму будаўніцтву дарожак для веласіпедыстаў. Акрамя гэтага, заахвочваюцца і аматары наведаць спартзалу. Існуе спецыяльная праграма, па якой прадпрыемства часткова выплачвае кошт абанемента на спартыўныя заняткі.

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ.** *yurgel@zviazda.by*

# Як жывецца ФАПу?

### Як яно ёсць

Між тым, у той ці іншай вобласці сёння можна адшукаць участковага педыятра, за якім замацавана літаральна 400—500 пацыентаў ва ўзросце да 18 гадоў. Зразумела, гэта ў сельскай мясцовасці, дзе варта ўлічваць не толькі сухія лічбы стандарту, але і інтарэсы бацькоў, якім не надта зручна будзе дабірацца з дзіцем да ўрача за блізкі свет.

Такога, на шчасце, нідзе і няма. Максімальныя адлегласці для тых жа ўрачэбных амбулаторый — 15—20 км. Сетка пярвічных медустаноў менавіта ў сельскай мясцовасці — гэта каля 2260 фельчарска-акушэрскіх пунктаў і 566 амбулаторый урача агульнай практыкі (усяго ў краіне 650 амбулаторый, якія існуюць нават пры паліклініках у новых буйных мікрараёнах абласных цэнтраў і Мінска). Такая колькасць пакуль лічыцца дастатковай, хоць сітуацыя можа мяняцца. Штогод выкананне дзяржаўнага стандарту ацэньваецца, вывучаецца сітуацыя — дзе захаваць або закрыць той ці іншы ФАП. А для таго, каб усе існуючыя ўстановы пярвічнага звяна працавалі паўнавартасна, менавіта сюды ў першую чаргу размяркоўваюцца маладыя спецыялісты.

### Хто ён, урач агульнай практыкі?

— Да 2020 года павінна завяршыцца перанавучанне ўрачоў пярвічнага звяна на ўрачоў агульнай практыкі, якія абслугоўваюць як дарослае, так і дзіцячае насельніцтва горада і вёскі,— тлумачыць **начальнік галоўнага ўпраўлення арганізацыі медыцынскай дапамогі Міністэрства аховы здароўя Алена БОГДАН.** — Да мінулага года магчымасць перападрыхтоўкі на ўрача агульнай практыкі была толькі ў Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі, але размова ідзе амаль пра 6 тысяч урачоў і досыць кароткі адрэзак часу, а таму адпаведныя кафедры былі створаны і ў медыцынскіх ВНУ.

Адпаведныя спецыялісты ўжо ёсць у сельскай мясцовасці, аднак па такім прынцыпе ўрэшце будуць працаваць абсалютна ўсе ўрачы пярвічнага звяна, у тым ліку гарадскія ўчастковыя тэрапеўты і педыятры. Усе павінны будуць авалодаць больш шырокімі ведамі па кардыялогіі, эндакрыналогіі, афтальмалогіі, неўралогіі. Зразумела, спатрэбіцца ім у рабоце і адпаведны інструментарый, які звычайна ёсць у пералічаных вузкіх спецыялістаў. Такім чынам, агляд пацыента будзе ўключаць не толькі вымярэнне артэрыяльнага ціску, частаты сардэчных скарачэнняў, частаты дыхання, ацэнку колеру скуры і, безумоўна, скаргаў пацыента, але і спецыфічны агляд, які праводзяць звычайна вузкія спецыялісты.

На вёсцы разам з урачом агульнай практыкі будзе працаваць акушэрка, патранажная (або ўчастковая) медсястра, якая вядзе ў тым ліку нованароджаных і дзяцей.

### Як не вы, то да вас

— Разам з тым урач агульнай практыкі мае пад рукой аўтатранспарт, што дазваляе забяспечыць выклікі на дом. З 2015 года ў Віцебскай і Мінскай абласцях дзейнічаюць перасоўныя ФАПы. Машына з доктарам прыязджае ў самыя малыя вёскі па графіку. На ФАПах працуюць і дзённыя стацыянары, дзе можна і ўкол зрабіць, і іншыя працэдуры. Флюарографаў, зразумела, няма, бо гэта патрабуе і асобнага памяшкання, і спецыяльна падрыхтаванага персаналу (усё ж такі радыяцыйны апарат), а галоўнае, запатрабаваны ён будзе толькі два тыдні на год, што, мякка кажучы, неэтазгодна. Як варыянт — перасоўныя флюарографы і пульмасканы, якія раз на год прыязджаюць на ФАП, у амбулаторыю або на прадпрыемства. На Віцебшчыне ёсць нават перасоўны комплекс, які дазваляе праводзіць яшчэ і мамаграфію. Дарэчы, з пэўнай перыядычнасцю прыязджаюць на ФАП і ўрачы амбулаторый (двойчы ў месяц вядуць прыём разам з урачом агульнай практыкі ФАПа), і спецыялісты вузкіх спецыяльнасцяў. Выязныя брыгады забяспечваюць у тым ліку штогадовы агляд ветэранаў Вялікай Айчыннай і асоб, прыроўненых да іх.

Урачы агульнай практыкі сёння настолькі блізка да людзей, што там, дзе насельніцтва не ігнаруе своечасовыя агляды, рэдкімі бываюць і выклікі хуткай. На вёсцы гэтай «хуткай» становіцца часам сам урач, які фактычна круглыя суткі на сувязі, добра ведае ўсіх, а ўсе ведаюць яго. Што да пастоў хуткай меддапамогі, то яны ёсць ва ўсіх буйных населеных пунктах і даязджаюць у любую кропку краіны за ўстаноўлены час.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

### І камп'ютары будуць

— Працэс камп'ютарызацыі — глабальная задача на наступныя гады — паспрыяе стварэнню адзінай інфармацыйнай сістэмы. Кожная ўстанова аховы здароўя будзе мець доступ да інфармацыі аб канкрэтным пацыенце. Гэта зручна і надзейна для ўсіх бакоў. Магчымасць азнаёміцца з тым, «як хварэў і дзе лячыўся» пацыент, будзе, вядома, і на ФАПе. Папяровыя медкарткі пры гэтым пакуль нікуды не знікнуць, — кажа Алена Богдан.

Новая пастанова па дыспансерызацыі пашырыла функцыі ўчастковага ўрача і ўрача агульнай практыкі, якім дадзена права лячыць шырокі пералік захворванняў. У межах дыспансерызацыі прадугледжана на ФАПе і магчымасць забору аналізаў крыві і мачы. Праўда, у некаторых выпадках для гэтага выязджае на месца лабарант амбулаторыі.

> **Даслоўна:**
>
> **— Не ўсюды адзін ФАП абслугоўвае столькі насельніцтва, колькі патрабуе стандарт. Дзесьці гэта можа быць і менш за 700—800 чалавек. Тым не менш ніводзін пункт не зачыняецца без рашэння мясцовых органаў улады і ўзгаднення з Міністэрствам аховы здароўя. Нават калі ФАП патрэбны толькі для 400—500 чалавек, яго могуць пакінуць. На Віцебшчыне існуюць нават ФАПы, паслугамі якіх карыстаецца не больш за 150 чалавек, бо ў выпадку іх закрыцця людзям будзе вельмі нязручна дабірацца да іншай медустановы.**

> **Даслоўна:**
>
> **Хутка ў краіне з'явіцца санітарная авіяцыя — ідзе закупка абсталявання для верталёта такой службы. Спецыялізаваная рэанімацыйная брыгада з урачом-рэаніматолагам і анестэзіёлагам будзе вылятаць на масавыя дарожна-транспартныя здарэнні і надзвычайныя сітуацыі па ўсёй краіне. Гэта, безумоўна, павышае хуткасць аказання дапамогі ў досыць цяжкіх выпадках, але кансультацыя ўрача можа спатрэбіцца і пры болі ў грудзях, і ў выпадку вірусной інфекцыі.**

Калі ў людзей маладых самай распаўсюджанай прычынай звароту ў медустанову застаюцца вострыя рэспіраторныя вірусныя інфекцыі, то для сталага насельніцтва характэрныя хранічныя захворванні — артэрыяльная гіпертэнзія, цукровы дыябет, астэапароз і артрозы, хранічная паталогія органаў дыхання, стрававання, вачэй, розныя неўралагічныя парушэнні. І ўсё гэта можа кантраляваецца на ўзроўні таго ж ФАПа. Аднак, калі ўзнікае неабходнасць у дадатковай кансультацыі, пацыент накіроўваецца ў цэнтральную раённую паліклініку, дзе ёсць свая спецыфіка прыёму вясковых жыхароў. Зразумела, што ўсе яны прыязджаюць на адным аўтобусе (на якую б гадзіну ні запісаліся), а таму ў паліклініках патокі сельскага і гарадскога насельніцтва падзелены. Вяскоўцы прыязджаюць зранку, а гараджан запісваюць на прыём пасля абеду. У кругласутачным рэжыме працуюць прыёмныя аддзяленні раённых бальніц, куды можна звярнуцца ў любы час сутак. Часцей за ўсё, гэта звароты з траўмамі.

Запатрабаваныя ў пажылых, асабліва зімой, і ўчастковыя бальніцы, а таксама бальніцы сястрынскага догляду, дзе забяспечваецца догляд і лячэнне. Адносіцца гэта да медыка-сацыяльнай дапамогі, а таму прадастаўляецца за аплату — 80 працэнтаў ад памеру пенсіі за месяц.

### Не толькі ў сталіцы

— У першую чаргу трэба сказаць, што брыгады хуткай меддапамогі аснашчаны ўжо не толькі дэфібрылятарам і апаратам штучнай вентыляцыі лёгкіх, але і сучаснымі тромбалітычнымі прэпаратамі, — удакладняе Алена Богдан. — Іх своечасовае ўвядзенне вельмі важнае пры ішэмічным інсульце або вострым каранарным сіндроме — гэта падаўжае час да моманту тэрапеўтычнага ўмяшання, якое праводзіцца ўжо на ўзроўні раённай медустановы. Рэанімабілі і ўрачы рэанімацыі ёсць ва ўсіх раёнах.

Усе абласныя цэнтры забяспечаны ангіёграфамі— вельмі дарагой сучаснай тэхнікай, неабходнай для правядзення каранарографіі. Яна выконваецца з мэтай як дыягностыкі, так і лячэння або прадухілення вострага каранарнага сіндрому, а ў хуткім часе стане магчымым праводзіць нават лячэнне вострага парушэння мазгавога кровазвароту. Першы такі праект у краіне ўжо завяршаецца. Ангіёграфы ўстаноўлены і ў Салігорску, Баранавічах, Пінску, гатова памяшканне ў Наваполацку. Паступова планецца аснасціць такой тэхнікай і адпаведнымі спецыялістамі ўсе міжраённыя цэнтры.

Апаратаў КТ і МРТ (камп'ютарная тамаграфія і магнітна-рэзанансная) ужо дастаткова па краіне. Толькі на двух участках — ва ўсходняй частцы Магілёўшчыны і заходняй на Віцебшчыне — не забяспечана пакуль дастаўка на працягу гадзіны на такія абследаванні. Аднак у 2017—18 гадах запланавана разам з заменай старых апаратаў камп'ютарнай тамаграфіі закупка і ў гэтыя два рэгіёны.

Аднак любая самая сучасная медтэхніка не можа быць важнейшай за пярвічны агляд, падчас якога ўрач якраз і можа накіраваць на падобнае абследаванне.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

protas@zviazda.by

МЕРКАВАННІ

## «Чаго не хапае медыцынскаму абслугоўванню ў вёсцы?»

Гэта пытанне мы задалі тым, хто мае самае непасрэднае дачыненне да азначанай тэмы.

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы Палаты прадстаўнікоў Валянціна КУРСЕВІЧ:**

— Я лічу, што сёння сельскай медыцыне ўсяго хапае. Першаснае звяно аказання медыцынскай дапамогі вельмі важнае — ад яго якасці залежыць далейшае лячэнне ўсіх пацыентаў. Неабходна сканцэнтраваць увагу на абслугоўванні менавіта жыхароў вёсак. Чаму? Таму што сёння працаздольных жыцця сельскага насельніцтва ў нас меншая, чым гарадскога. У прыватнасці, у мужчын. Працягласць жыцця павінна павялічвацца. Для гэтага трэба забяспечыць на сяле якасць аказання медыцынскай дапамогі, укараніць новыя тэхналогіі. Павінна быць укамплектаванасць урачэбным і сярэднім медыцынскім персаналам. Акрамя таго, неабходна правесці шэраг мерапрыемстваў, каб замацаваць там маладыя кадры пасля размеркавання.

**Галоўны ўрач Кіраўскай цэнтральнай раённай бальніцы Алена КРУЦЬКО:**

— Сёння нам не хапае грашовых сродкаў. Кадрамі мы дастаткова добра забяспечаны, матэрыяльная база ў нас нядрэнная, але патрабуюцца матэрыяльныя ўкладанні. У Кіраўскім раёне ў ахове здароўя фінансаванне на аднаго жыхара — самае нізкае. Побач з намі знаходзіцца Бабруйск. Законам дазволена атрымліваць дапамогу ўсюды, куды звяртаешся. Таму нашы жыхары звяртаюцца туды, грошы, адпаведна, пераразмяркоўваюцца на Бабруйск. Хацелася б мець большае фінансаванне.

**Старшыня Багушэвіцкага сельскага Савета Бярэзінскага раёна Ларыса БАБІНОВІЧ:**

— Што я хацела б? Па-першае, каб бальніцу, якія знаходзяцца на тэрыторыі сельскіх населеных пунктаў, не закрываліся б. Чаму? Таму што сельскае насельніцтва старэе. Ім складана дабірацца ў раённы цэнтр, ім лягчэй даехаць у мясцовую бальніцу. Тут працаваць наведаць іх, прасцей лячыць, бо побач дом. І пажылыя жыхары адчуваюць сябе больш разняволена, таму і лячэнне ідзе больш эфектыўна. Гэта мае вялікае значэнне менавіта для псіхалагічнага стану хворага. Хацелася б большую колькасць спецыялізаваных урачоў — стаматолагаў напрыклад. У сельскай мясцовасці гэтага не хапае. Адно з няпростых пытанняў — жыллё для спецыялістаў. Калі будзе жыллё, то ўрачы будуць прыязджаць і працаваць.

**Жыхар вёскі Гольчыцы Слуцкага раёна Аляксандр КАРЛАЎ:**

— Колькі я ні звяртаўся ў мясцовую бальніцу, мне ніколі не адмаўлялі і заўсёды дапамагалі. Напрыклад, якасць працы стаматолага ў вёсцы мяне задавальняе больш, чым у горадзе. Вельмі радуе стаўленне да пацыента — тут яно нейкае прасцейшае і спакайнейшае. Адзінае, што можна палепшыць, — апаратуру. Акрамя таго, бываюць моманты, калі забяспечанасць лекамі вымушае жадаць лепшага. Напрыклад, у мяне была сітуацыя: трэба было выдаляць зуб, і ўрач сказаў рабіць гэта хутчэй. Чаму? Таму што засталося ўсяго некалькі ампул лекаў, а больш маглі і не прывезці. Але ўзровень абслугоўвання мяне больш чым задавальняе. Няма ні заўваг, ні нараканняў.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

lukashevich@zviazda.by

Працяг тэмы на стар. 6—7

# УМЕЦЬ СЛУХАЦЬ І ЧУЦЬ



***Павел СУХАРУКАЎ:* На працягу апошніх 12 гадоў у газеце «Звязда» выходзіць праект «Мясцовае самакіраванне». У гэтым годзе мы перайшлі на новы фармат выдання «МС», якое цяпер выпускаецца штотыднёва на паперы павышанай якасці. У найбліжэйшай перспектыве яно будзе выдавацца сшыткам. І таму нам цікава пачуць ад вас, шаноўных калегі, якой павінна быць прэса, што асвятляе тэму мясцовай улады, якім чынам лепей падаваць інфармацыю па гэтай тэме. Нас цікавіць, якімі павінны быць прадстаўнікі самай бліжэйшай да людзей галіны ўлады на сучасным этапе. Да новых выбараў у мясцовыя саветы дэпутатаў застаўся год. Якія высновы нам варта зрабіць?**



**Віктар РАЖАНЕЦ:** Ці шмат людзей прыходзяць на справаздачы дэпутата сваёй акругі? Я больш чым перакананы, зыходзячы са сваёй практыкі, што большая частка нават не задумвалася пра гэта. Затое ўсе чакаюць, што дэпутат дапаможа дарогу зрабіць, абсталяваць дзіцячую пляцоўку. Ён і павінен гэтым займацца, — калі праблема не вырашаецца арганізацыямі, якія непасрэдна за гэта адказваюць. Чамусьці нярэдка бываюць выпадкі, калі людзі напрамую звяртаюцца па дапамогу да дэпутата, абмінуўшы тыя арганізацыі, якія адказваюць за стан сваіх аб'ектаў. Дапамога — гэта адна са сфер дзейнасці дэпутата, аднак яшчэ адна не менш значная — заканатворчасць на мясцовым узроўні, вынікам якой будзе паслядоўнае і планамернае вырашэнне надзённых праблем.

Не ўсе ведаюць, што ёсць тры ўзроўні мясцовых саветаў — абласны, базавы і першасны. На маю думку, дэпутаты кожнага ўзроўню маюць сваю вагу ў плане паўнамоцтваў. Але найбольш дзейсныя базавыя — раённыя і гарадскія (гарадоў абласнога падпарадкавання) саветы дэпутатаў. Таму што першасны ўзровень — гэта пасялковыя, сельскія, гарадскія (гарадоў раённага падпарадкавання) саветы дэпутатаў — не заўсёды гатовы вырашаць усе праблемы часта з-за ўрэзанасці бюджэту. Але пры гэтым яны, як ніхто іншы, блізкія да сваіх выбаршчыкаў. Абласныя саветы вырашаюць больш глабальныя пытанні, якія датычацца менавіта вобласці. А сувязнае звяно паміж імі — базавы ўзровень. У прыватнасці, раённы.



**Аляксандр ПАПКОЎ:** Вы выказалі думку, што чалавек адразу павінен звяртацца непасрэдна ў арганізацыю... І што, ён будзе хадзіць па інстанцыях, па гэтым замкнёным коле? Я працую больш чым 40 гадоў ва ўладных структурах і ведаю, што можна так «накіраваць» чалавека, ён да другога прышэсця не адшукае адказ на сваё пытанне. Калі чалавек прыйшоў да дэпутата і абазначыў праблему, то трэба калі не вырашыць яе ў адзін момант, то хоць бы акрэсліць тэрмін, калі вынік будзе дасягнуты. Мы не маем права адштурхнуць запыт чалавека. А калі вырашыць штосьці не атрымліваецца, то навошта нам такі дэпутат?

Народны абраннік павінен задавальняць інтарэсы людзей. Кожны дэпутат мае права выносіць пытанні на неабходны ўзровень. Перш за ўсё, гэта сесія. Бо ні адзін орган, акрамя сесіі, не зацвярджае праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця на сваім тэрытарыяльным узроўні. Ад таго, наколькі разумна мы будзем фарміраваць іх, наколькі востра будзем адзначаць тыя праблемы, якія ёсць у пэўным рэгіёне, сяле ці горадзе, будзе залежаць дабрабыт краіны.

Менавіта дэпутаты мясцовых саветаў фарміруюць бюджэт і зацвярджаюць яго. І даходную, і расходную частку. Таму, калі сёння ў чалавека няма магчымасці напіцца чыстай вады, нармальна пад'ехаць да дома, вырашыць пытанні бяспекі свайго дзіцяці, — хто першым павінен падняць гэтую праблему на дзяржаўным узроўні і вырашыць яе? Вядома, дэпутат. Аб уладзе, аб дзяржаве, аб кіраванні ў дзве трэція судзяць па тым, як вырашаюцца пытанні людзей на месцах.

> Мы павінны менш абмяркоўваць, а больш рабіць. Увесь сэнс мясцовага самакіравання заключаецца ў тым, каб зрабіць нешта на гэтай зямлі і людзі гэта ацанілі.

Раней, у савецкія часы, многія пытанні на сябе брала дзяржава і вырашала іх. Сёння ж узровень мясцовага самакіравання трэба падняць на такую вышыню, каб яно магло без перашкод вырашаць разнастайныя сацыяльныя праблемы.



Інстытут сацыялогіі Нацыянальнай акадэміі навук правёў даследаванне. Ведаюць сваіх дэпутатаў рэспубліканскага і абласнога ўзроўню адпаведна толькі кожны дзясяты і сёмы рэспандэнты. Крыху лепш ідуць справы з веданнем дэпутатаў раённых і сельскіх саветаў. Адпаведна, 28% і 21%. Менш за ўсё сваіх дэпутатаў ведаюць у буйных гарадах. Праведзенае сацыялагічнае апытанне насельніцтва сведчыць аб тым, што дэпутаты саветаў усіх узроўняў досыць рэдка бачацца са сваімі выбаршчыкамі. Толькі ад 2,5% да 10% апытаных грамадзян на працягу апошняга года перыядычна сустракаліся са сваімі дэпутатамі. Што датычыцца ўзроўню інфармаванасці насельніцтва аб працы саветаў, то па выніках сацыялагічнага апытання на поўную інфармаванасць паказала ад 0,7% да 2,8%. Атрымліваецца, што людзі не заўжды ведаюць, чым займаецца ўлада.



**Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ:** Сапраўды, сітуацыя складваецца так, што трэба праінфармаваць выбаршчыкаў пра іх правы і магчымасці, у тым ліку і абавязкі. Гэта задача не толькі дадатку «Мясцовае самакіраванне», але і іншых сродкаў масавай інфармацыі. Сёння ў краіне зарэгістравана больш за 1600 газет, часопісаў, альманахаў, бюлетэняў. Не ўсе з іх — выданні грамадска-палітычныя, але тыя, чые праблемна-тэматычныя кірункі знаходзяцца ў фармаце зносін з уладай, павінны больш увагі звяртаць на дадзеную тэму. Задача і «МС», і іншых СМІ — спалучыць дэпутата і выбаршчыка.



**Леанід ЦУПРЫК:** Дэпутат павінен быць пазнавальны сярод тых, хто яго абраў. Вось возьмем тыраж раённай газеты — каля 6 тысяч экзэмпляраў. Памнажаем на 3 ці 4, па колькасці членаў сям'і. Значыць, калі рэгулярна ў ёй друкуюцца матэрыялы аб працы дэпутата, аб прамых лініях, аб прыёмах грамадзян, якія ён праводзіць, то, напэўна ж, чалавек павінен запомніць хоць бы прозвішча дэпутата! Ёсць інтэрнэт, ёсць адпаведныя сайты. Але існуе адзін нюанс: чалавек не абавязаны чытаць усё, што яму прапануецца.

Галоўны сакрэт пазнавальнасці дэпутата — гэта выніковасць. Галоўны вынік працы — вырашаныя праблемы выбаршчыкаў. Але тут галоўная складанасць у тым, што яны, праблемы, вельмі разнапланавыя. Дэпутат выказвае інтарэсы людзей, але людзі вельмі розныя. Тым не менш рашэнне пытанняў выбаршчыкаў для дэпутата павінна быць першараднай задачай.

Калі адбываецца распрацоўка законапраекта, мы зацікаўлены ў тым, каб ён быў поўным, вычарпальным, выканальным. У законе «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні» ў главе 3 размова ідзе пра тэрытарыяльнае грамадскае самакіраванне. У артыкуле 26 гаворыцца, што «асноўнай мэтай тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання з'яўляюцца развіццё і ажыццяўленне на адпаведнай частцы адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі ініцыятыў грамадзян па пытаннях мясцовага значэння». Менавіта гэтая структура можа вырашыць існуючыя праблемы. Гэтая частка закона недастаткова выкарыстоўваецца людзьмі, у тым ліку і мясцовымі саветамі. І калі артыкул 26 будзе працаваць, а яго магчымасці пачнуць цалкам выкарыстоўвацца, многія пытанні грамадзян пачнуць вырашацца хутчэй.

Кажучы пра іншыя якасці дэпутата, думаю, што ён павінен успрымаць усё новае, выкарыстоўваць прагрэсіўныя падыходы, ведаць, як і што адбываецца ў свеце, як працуе мясцовае самакіраванне ў іншых краінах, асабліва ў найбліжэйшых суседзяў — у СНД і ў Еўропе. Многія тамтэйшыя працэсы ў дадзенай сферы супадаюць з нашымі: звязаныя з тэрытарыяльным дзяленнем, узбуйненнем мясцовых суполак. І безумоўна, сам дэпутат павінен мець энергію для самаразвіцця і актыўнай працы.



**Георгій АТАМАНАЎ:** На маю думку, трэба больш увагі ўдзяляць развіццю грамадскага самакіравання на месцах. Я другое скліканне ў Мінскім гарадскім Савеце дэпутатаў займаюся непасрэдна гэтай праблематыкай. Так, у нашых мікрараёнах дзейнічаюць калегіяльныя органы, але Мінск досыць спецыфічны ў гэтым плане рэгіён, дзе існуе адзіны орган самакіравання — гэта Мінскі гарадскі Савет, у якім працуе 57 дэпутатаў. Больш падобных структур няма.

Калі ў 2010 годзе ў нас працавала 38 камітэтаў тэрытарыяльнага самакіравання, то сёння іх ужо 129. Трэба было адшукаць 129 актывістаў, гатовых вырашаць праблемы на сваёй тэрыторыі. Мы пайшлі далей. У сталіцы 9 раёнаў, і адзін з нашых дэпутатаў гарадскога Савета з'яўляецца старшынёй раённага грамадскага Савета камітэтаў тэрытарыяльнага самакіравання. У раёнах мы штоквартальна праводзім конкурс на самы лепшы Камітэт грамадскага самакіравання, раз на год падводзім вынікі. Акрамя таго, мы адшукалі магчымасць у бюджэце сталіцы выдзеліць сродкі для грамадскіх дзеячаў, якія працуюць у камітэтах.

Ведаеце, да дэпутата людзі прыходзяць не з радасці. За сем гадоў працы ні аднаго такога выпадку ў мяне не было. Заўжды ідуць з бядой. Таму трэба быць псіхалагічна падрыхтаваным, каб выслухаць чалавека, паспрабаваць зразумець, стаць на пазіцыю таго, хто да цябе звярнуўся, адшукаць спосаб рашэння праблемы.

**Аляксандр ПАПКОЎ:** Задача дэпутата заключаецца не толькі ў тым, каб вырашыць асобна ўзятую побытавую праблему, а каб падняць пытанні, актуальныя для кожнага. Я хачу падкрэсліць, што часта стрымліваючым фактарам у дзейнасці могуць стаць фінансы і іх недахоп.



**Ігар ЖУК:** Усё адно, каб падняць статус органаў мясцовага самакіравання, бюджэту ніколі не хопіць. Мы арыентуемся на вопыт нашых суседзяў: Літвы, Польшчы, іншых краін. Бюджэты мясцовых органаў у Еўропе і ў нас, у прынцыпе, можна супаставіць па памеры. Самае галоўнае, там органы мясцовага самакіравання шукаюць пазабюджэтныя сродкі, там усе займаюцца праектнай, грантавай дзейнасцю. Нашы сельскія і раённыя саветы толькі на пачатку гэтага шляху. Прыедзьце ў той сельсавет, які выйграў такі грант, няхай невялікі — 10 ці 20 тысяч долараў, — але гэтыя грошы пайшлі на добраўпарадкаванне тэрыторыі, асвятленне дарог, рамонт сацыяльнага аб'екта. Гэта адразу заўважна. Такога дзейснага старшыню сельскага Савета будуць ведаць і без агітацыі. Падчас выбарчай кампаніі ў Еўропе адбываецца аналіз: што дэпутат ці кіраўнік мясцовай адміністрацыі канкрэтна прынёс на сваю тэрыторыю? Неблагі вопыт, які можна пераняць. Тым больш сёння мы цвёрда стаім на нагах і таму можам займацца дэцэнтралізацыяй улады, даваць больш аўтаноміі органам мясцовага самакіравання.



**Аляксандр ІВАНОЎСКІ:** У нашай краіне мясцовая ўлада — гэта дзяржаўная ўлада. Так адбываецца не ва ўсіх дзяржавах. Такая сістэма, як наша, валодае станоўчай якасцю — хуткадзейнасцю. Можна за два дні выдаць Указ Прэзідэнта. У савецкія часы на дакумент падобнага ўзроўню магло пайсці 3,5 месяца. Таму, калі мы задзейнічаем чужы вопыт, то павінны яго разумова адаптаваць. У Шатландыі, напрыклад, дэпутат дае справаздачу па 30 крытэрыях. На першым месцы — навыкі і кампетэнтнасць. Мы вывучалі гэтыя крытэрыі ў розных рэгіёнах. У кожным з іх яны свае: у адных 2, у іншых — 66. У той жа час у Беларусі кампетэнцыі дэпутата замацаваныя ў адпаведным законе, пра іх кожны можа даведацца. Я прапаную два кірункі, па якіх можна ацаніць работу дэпутата: непасрэдна зробленае ім для выбаршчыкаў і якая ад праведзенай работы эфектыўнасць у выніку.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й «МС».)*



**Аляксандр ПАПКОЎ:** Але для чаго выкарыстоўваюцца крытэрыі ацэнкі дэпутата? Каб ён у канцы сваёй працы выйшаў з гэтай паперай і сказаў: вось я ўнёс, вось я зрабіў? Дэпутат — гэта абраннік народа. Яго павінен ацэньваць народ.

> Калі чалавек будзе агучваць сваю праблему менавіта дэпутату, то ў нас стане нашмат менш скаргаў і зваротаў, якія паступаюць у розныя органы.

**Аляксандр ІВАНОЎСКІ:** Я мяркую, што частка, якая датычыцца актыўнасці, выніковасці працы ў рэалізацыі дзяржаўнай інфармацыйнай палітыкі, узаемадзеяння са СМІ, можа быць выкарыстана пры справаздачы дэпутата. У той жа час канчатковы вынік павінен выходзіць з работы Савета ў цэлым. Калі казаць пра сацыяльныя стандарты, то іх можна сабраць, яны існуюць у нас у органах кіравання. Паказчыкі, пра якія я кажу, таксама закладзены ў органах улады. Вельмі важна не блытаць выканаўчую ўладу і працу дэпутата.

***Павел СУХАРУКАЎ: По сутнасці пытання, якое падняў Аляксандр Уладзіміравіч, хацелася б паслухаць дэпутатаў розных узроўняў. Пачуць іх думкі: як яны ацэньваюць крытэрыі эфектыўнасці працы дэпутата? Чым павінен займацца дэпутат, каб яго выбаршчыкі падчас справаздачы далі яго рабоце станоўчую ацэнку?***



**Жанна ВАРАБЕЙ:** На сённяшні дзень у нас склалася пэўная сістэма работы па ўзаемадзеянні органаў мясцовай улады, дэпутацкага корпуса і органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання. Для таго каб эфектыўна вырашаліся пастаўленыя задачы — а гэта перш за ўсё павышэнне ўзроўню якасці жыцця насельніцтва. — велізарнае значэнне мае персанальны склад дэпутацкага корпуса. На першы план выходзіць асоба кіраўніка, жыццёвы вопыт і прафесійныя якасці, неабыякавая пазіцыя да таго, што адбываецца на тэрыторыі. Акрамя таго, важнай якасцю для дэпутата і любога кіраўніка ў прынцыпе з'яўляецца ўменне слухаць чалавека і здольнасць пачуць яго.

Што датычыцца нашай сістэмы, то, акрамя 15 дэпутатаў сельсавета, у кожным населеным пункце абраны старасты. Усе яны з'яўляюцца добрымі памочнікамі для мяне. Самае галоўнае, каб дэпутаты былі сумленнымі і справядлівымі. Не давалі тых абяцанняў, якія не змогуць выканаць. Аказвалі ўсялякае садзейнічанне і стараліся вырашаць усе праблемы грамадзян. Бо дэпутат — гэта сувязнае звяно паміж людзьмі і уладай. І я не згодна з тым, што для вырашэння канкрэтнай праблемы людзі павінны адразу ісці ў канкрэтную службу. Мы прадстаўляем інтарэсы грамадзян. Паўнамоцтваў мясцовых саветаў хапае, каб дэпутаты маглі адстойваць інтарэсы перад спецыялізаванымі арганізацыямі, акрамя таго, у нас наладжаны цесныя сувязі з гэтымі структурамі. І людзі бачаць, што мы працуем, і ацэньваюць працу дэпутата па канкрэтным рэальным выпадку. Яшчэ адзін важны фактар — гэта стаўленне саміх людзей, як яны ацэньваюць тое, што ўжо зроблена. Тут роля дэпутата таксама не апошняя: трэба правесці тлумачальную работу аб беражлівых адносінах да таго ж двара, да той жа вуліцы. Акрамя таго, я згодна, што ацэнкі дзейнасці дэпутата павінны даваць людзі. Дарэчы, у нас людзі ведаюць дэпутатаў.



**Іван ЛІПНІЦКІ:** Жанна Аляксандраўна, часам бывае, што некаторыя людзі не ведаюць дэпутатаў па сваёй выбарчай акрузе, нягледзячы на шырокае інфармаванне ўсіх удзельнікаў працэсу яшчэ ў перыяд выбарчай кампаніі. Узнікае заканамернае пытанне: чаму? Падзіцеся, што ёсць пэўны сэнс у выказванні: добрая ўлада тая, якую не заўважаюць. Значыць, дэпутаты робяць усё, каб людзі спакойна жылі і працавалі. У ходзе прамой лініі з насельніцтвам, на сходах, асабістых прыёмах грамадзян многія кажуць: трэба вырашыць дадзеную праблему сёння і менавіта ў гэты тэрмін. І мы гэта робім. Але трэба разумець, што ёсць праблемы, вырашэнне якіх патрабуе пэўнага часу, сродкаў, камісійнага абмеркавання, канкрэтнага выезду на месца. Ёсць бюджэт, ёсць планы, і роля дэпутата, — у тым ліку растлумачваць і данесці да ведама сваіх выбаршчыкаў гэтыя пытанні. Часам людзі нібы і не разумеюць, што для пабудовы тых жа дарог патрэбны немалыя сродкі. Вырашаем і гэтыя праблемы. Часам прапануем нейкую частку неабходнай працы рабіць калектыўна з насельніцтвам. І людзі згаджаюцца, бо бачаць вынікі.

Якім павінен быць дэпутат? Трэба зразумець, што дэпутаты ўжо ёсць. І гэта людзі, вядомыя ў акрузе. Напрыклад, часцей за ўсё гэта кіраўнікі арганізацый, прадпрыемстваў, настаўнікі і дырэктары школ, якім выбаршчыкі аказалі свой давер і якія на высокім узроўні выконваюць свае абавязкі. Дэпутатамі толькі Мінскага абласнога Савета з пачатку склікання прынята больш за 200 рашэнняў па пытаннях паўсядзённага жыцця насельніцтва — і гэта таксама вялікая праца.

**Аляксандр ПАПКОЎ:** Сёння стаіць пытанне: што трэба зрабіць для таго, каб укараніць элементы Еўрапейскай Хартыі мясцовага самакіравання? Каб кадры на месцах маглі вырашаць надзённыя праблемы. Мы маем права ствараць так званыя асацыяцыі. Яны існуюць у Гродне і Магілёве, але пакуль ніякай змястоўнай ідэі ў сабе не нясуць. Таму ў хуткім часе мы на Савеце па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пагледзім, што трэба зрабіць. Ёсць такая ідэя, каб ва ўсіх абласцях мець гэтыя асацыяцыі. І трэба стварыць нацыянальную асацыяцыю, па сутнасці — міністэрства, якое будзе працаваць за кошт гаспадарчай дзейнасці. І мы павінны ствараць адпаведныя структуры, якія будуць напрацоўваць пэўную прадукцыю і ствараць фонды для вырашэння праблем жыццезабеспячэння. У рэшце рэшт, нам трэба зарабляць грошы і даць мясцовым саветам інструмент, праз які яны будуць вырашаць гэтыя пытанні. За гэты год мы будзем назапашваць вопыт, каб у будучыні такую арганізацыю мець. У Бараўлянскім сельскім Савеце дэпутатаў ёсць патэнцыял, людзі гатовыя працаваць. Але ёсць рэгіёны, у якіх існуюць складанасці, каб абраць дэпутата. Таму трэба шукаць людзей неабыякавых. І важна адзначыць, што мы павінны менш абмяркоўваць, а больш рабіць. Закатаць рукавы і працаваць. Увесь сэнс мясцовага самакіравання заключаецца ў тым, каб зрабіць нешта на гэтай зямлі і людзі гэта ацанілі.



**Наталля СУШКО:** Я адназначна згодна з тым, што ацэнку дэпутату павінен даваць выбаршчык, таму што людзі аддаюць свой голас за дэпутатаў. А што значыць «аддаць голас»? Гэта значыць менавіта гэты чалавек з'яўляецца аўтарытэтным грамадзянінам і можа агучыць праблемы, зрабіць усё магчымае, каб іх вырашыць. У першую чаргу дэпутат павінен быць неабыякавым чалавекам, ён павінен навучыцца жыць праблемамі людзей сваёй акругі, прапускаць іх праз сябе, перажываць іх так, як і яго выбаршчык.

Маё глыбокае перакананне заключаецца ў тым, што павінна быць зваротная сувязь з дэпутатам. Калі чалавек будзе агучваць сваю праблему менавіта дэпутату, то ў нас стане нашмат менш скаргаў і зваротаў, якія паступаюць у розныя органы. На жаль, да нас людзі не ідуць з добрым. Чалавек нясе нам свой боль, сваю бяду, сваю праблему. І дэпутат павінен пачуць і, не даючы лішніх абяцанняў, прыкласці ўсе намаганні, сваю кампетэнтнасць і асабістую зацікаўленасць, каб па магчымасці гэтую праблему вырашыць.



> Аб уладзе, аб дзяржаве, аб кіраванні на дзве трэція судзяць па тым, як вырашаюцца пытанні людзей на месцах.

Дэпутат павінен быць адкрытым для ўсіх. Ён абавязаны ісці ў народ, праводзіць сустрэчы з выбаршчыкамі, сустракацца з працоўнымі калектывамі, удзельнічаць у мерапрыемствах рознага ўзроўню. Трэба быць прыкладам актыўнай жыццёвай пазіцыі і далучаць сваіх выбаршчыкаў да ўдзелу ў грамадскай дзейнасці. Толькі разам усе мы зможам палепшыць якасць нашага жыцця і вырашыць праблемы жыццезабеспячэння грамадзян. Мы павінны быць народнымі, а не іншароднымі дэпутатамі.

**Аляксандр ПАПКОЎ:** Ёсць адна вельмі вялікая і глабальная праблема цяперашняга этапу — гэта наша моладзь. Мы павінны на месцах, асабліва ў рэгіёнах, бачыць, чым займаецца наша моладзь. Сёння моладзь іншая, і запыты іншыя. Маладыя людзі больш адукаваныя. Мы павінны напрацоўваць тут адпаведныя падыходы. Не зробім гэта сёння — заўтра могуць быць праблемы.

Моладзь для нас першасная, яна — будучыня краіны. Акрамя таго, неабходна прапрацаваць пытанне пашырэння паўнамоцтваў дэпутатаў. Мы павінны добра даследаваць наша заканадаўства. Калі мы ставім вялікія задачы, то павінны даваць адпаведныя магчымасці для рэалізацыі. Таму і праз СМІ шукаем падыходы, каб інфармаваць наша насельніцтва. Магчыма, аднаго нашага дадатку да «Звязды» «Мясцовага самакіравання» — недастаткова, каб падымаць глабальныя праблемы.



**Лілія АНАНІЧ:** Я хацела б адзначыць, што мы абмяркоўваем найважнейшую тэму. Гэтая тэма павінна быць у цэнтры ўвагі ўсіх грамадска-палітычных выданняў. На рускай мове, на беларускай мове, таму што гэтая тэма — усё тое, што звязана з жыццём людзей. І я згодна, што адной газеты тут недастаткова. Таму я ўношу такую прапанову: давайце разам знойдзем нейкую форму, пагледзім на прыкладзе найлепшых рэгіёнаў, як працуе наша рэгіянальная прэса, якія ў яе дасягненні. Каб усё працавала эфектыўна, патрэбен глыбокі аналіз і зацікаўленасць. Давайце падзелімся гэтым вопытам, каб сродкі масавай інфармацыі больш эфектыўна ўплывалі на рэалізацыю задач, якія сёння стаяць перад нашымі органамі ўлады.

У сучасным свеце СМІ павінны быць лёгкімі на ўздым. І не на словах, а на справе. Бачыць перамены і самім дэманстраваць магчымасць мяняцца ў лепшы бок для больш эфектыўнай работы. Я лічу, што для вырашэння канкрэтных праблем людзей існуюць канкрэтныя службы, аднак стаўленне да таго ці іншага пытання праз мясцовую ўладу павінна быць выразным і зразумелым. Звярнуліся людзі — значыць, трэба так правесці работу, каб чалавек не адчуў, што ён не цікавы.

**Аляксандр ПАПКОЎ:** Хачу звярнуць увагу, што круглы стол праходзіць пад эгідай сродкаў масавай інфармацыі. СМІ павінны расказваць аб праблемах і пытаннях, якія агучваюцца з вялікай трыбуны. Бо, па сутнасці, гэта тыя ўстаноўкі, паводле якіх павінна развівацца дзяржава.

Калі мы гаворым аб ацэнцы дзейнасці любога органа дзяржаўнай улады, трэба звяртаць увагу на вырашэнне канкрэтных задач.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**
lukashevich@zviazda.by
**Вераніка ПУСТАВІТ.**
pustavit@zviazda.by
**Фота Надзеі БУЖАН.**

# НА ПЕРАКРЫЖАВАННІ БОЛЮ І НАДЗЕІ

**— Сэрца ў мяне ўжо дрэннае — надта многа пражыла. А тут ціск раптам падняўся, а таблеткі скончыліся, — расказвае 84-гадовая жыхарка вёскі Балотня, што ў Рагачоўскім раёне, Лідзія Лаўрэнцьеўна Тумарава. — Мне так дрэнна стала — не ведала, што рабіць. Дык вось выратавалі — сюды, у Доўскую бальніцу прывезлі. Добра тут, усе клапоцяцца пра нас, хай ім Бог многа гадоў дае.**

Жвавая маленькая жанчына расказвае, што ў мясцовай лячэбнай установе ляжыць два разы на год. Кажа: пракапаюць — і далей можа справамі займацца:

— Я ж бабка хоць хворая, але ні хвілінкі на месцы не сяджу. У мяне гаспадарка: кур трэба накарміць і дровы прывезці...

Лечыцца Лідзія Лаўрэнцьеўна ў паліятыўным аддзяленні. У асобных палатах тут ёсць тэлевізар, у кожнай — зручны санітарны блок. Пры неабходнасці выкарыстоўваюцца супрацьпролежневыя матрацы, купленыя на ахвяраванні спонсара. Звычайна такія аддзяленні прызначаны для анкалагічных хворых, але сёння тут лечацца і пацыенты са складанымі сардэчна-сасудзістымі, лёгачнымі і іншымі захворваннямі.

— Вясковае насельніцтва сталее, — заўважае **галоўны ўрач установы Наталля ГАЎРУШКА**. — Да таго ж людзі часта застаюцца адзінокімі. Таму ў нас тут ляжаць з хваробамі, пры якіх не могуць сябе абслугоўваць. Пры гэтым сталым



**Ціск Лідзіі Тумаравай вымярае галоўны ўрач Доўскай участковай бальніцы Наталля ГАЎРУШКА.**

людзям, каб палепшыць якасць жыцця, патрэбны не толькі догляд, але і карэкціроўка лячэння.

Дарэчы, аграгарадок Доўск Рагачоўскага раёна знаходзіцца ў месцы, дзе перакрыжоўваюцца дзве буйныя аўтамагістралі. А гэта здаўна азначае яшчэ і тое, што менавіта ў Доўскую ўчастковую бальніцу ў першую чаргу паступаюць экстранныя пацыенты з трасы. Менавіта тут аказваюць першую прафесійную медыцынскую дапамогу ўсім, хто трапляе ў аварыю. Такой практыкі заўсёды хапала. Нават тады, калі ўстанова, заснаваная яшчэ ў 1914 годзе, знаходзілася ў невялічкім драўляным дамку каля царквы.

**Анжаліка КУПЦОВА, галоўны ўрач Рагачоўскай цэнтральнай раённай бальніцы:**

*—Ва ўчастковай бальніцы той жа ўрач-тэрапеўт — не толькі тэрапеўт, але і кардыёлаг, і гастраэнтэролаг, і нефролаг, і рэўматолаг... Ён тут — усё, бо бываюць экстранныя сітуацыі, калі пацыент нетранспартабельны і яго нельга накіраваць у раённую ці абласную бальніцу. У Доўску працуюць сапраўдныя прафесіяналы, якія многіх людзей выцягнулі з таго свету.*





**Доўская ўчастковая бальніца.**

Трохпавярховы будынак, дзе бальніца размешчана цяпер, здалі ў 1978 годзе. І калі б не Чарнобыль, магчыма, была б увасоблена ў жыццё ідэя пра існаванне ў Рагачоўскім раёне дзвюх раённых бальніц: у самім Рагачове і ў Доўску. Цяпер на абслугоўванні Доўскай участковай — больш за 3,5 тысячы чалавек. Таму 70 ложкаў ніколі не пустуюць. 20 з іх адносяцца да аддзялення паліятыўнай дапамогі, столькі ж — у аддзяленні сястрынскага догляду, а астатнія — тэрапеўтычныя. У паліклініцы ідзе штодзённы прыём пацыентаў.

**Урач Вольга БАРУЦЕНКА** — выпускніца Гомельскага медыцынскага ўніверсітэта. За час пасля размеркавання дарасла да пасады загадчыцы тэрапеўтычнага аддзялення.

На пытанне «Чаму навучыла вясковая бальніца?» адказвае, што экстранныя выпадкі дадаюць вопыту і ўпэўненасці ў сваіх сілах:

— Гэтага за два гады ў мяне дакладна прыбавілася. Самі дыягнастуем і лечым. Такім чынам развіваецца клінічнае мысленне. Тут многа робіш — не толькі тое, што павінен у адпаведнасці з пасадай. А яшчэ мне тут калектыў вельмі падабаецца — ад малодшага персанала да начальства.

Сёння жыхарам Доўска і наваколля не трэба ехаць у Рагачоў, каб набыць неабходныя медыкаменты ці запламбаваць зубы. Аптэка знаходзіцца тут жа — у будынку бальніцы, а кваліфікаваную стаматалагічную дапамогу акажуць, выкарыстоўваючы сучаснае абсталяванне. Ну а калі чалавек ведае, што ён можа як трэба падлячыцца недалёка ад дома, — ён і жыве з іншым настроем.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
*iost@zviazda.by*

УНП 491058984

## ООО «ЦЕНТР ЭКСПЕРТ УСЛУГ»

**по поручению ликвидатора частного предприятия «Сервис В2В» проводит открытый аукцион по продаже имущества ОДО «Трансстрой», г. Мозырь, ул. Ленинская, д. 39**

| Лот № | Наименование предмета аукциона | Начальная цена лота, в т.ч. НДС, руб., коп. | Задаток 10%, руб., коп. | Шаг аукциона – 5%, руб., коп. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Грузовой автомобиль MAZ 533702, 2007 г. в., рег. №АВ 1569-3, цвет – белый, номер кузова (рама) Y3M53370270008793, тип ТС – грузовой автобетоносмеситель | 15 240,00 | 1 524,00 | 762,00 |
| 2 | Грузовой автомобиль KAMAZ 53229, 2007 г. в., рег. №АЕ 6861-3, цвет – оранжевый, номер кузова (рама) XTC53229R72296841, тип ТС – грузовой автобетоносмеситель | 17 040,00 | 1 704,00 | 852,00 |
| 3 | Автокран МАЗ 5334 КС 3577, 1988 г. в., рег. №ЕМ4324, цвет – красный, номер кузова (рама) 2740, тип ТС – грузовой крановая установка | 9 480,00 | 948,00 | 474,00 |
| 4 | Легковой автомобиль VOLKSWAGEN CADDY, 2007 г. в., рег. №9866 ВЕ-3, цвет – сине-зеленый, номер кузова (рама) WV2ZZZ2KZ8X046711, тип ТС – легковой комби | 10 800,00 | 1 080,00 | 540,00 |
| 5 | Самосвал МАЗ 555102 2123, 2004 г. в., рег. №ЕС 8382, цвет – белый, номер кузова (рама) Y3M55510240004448, тип ТС – грузовой самосвал | 12 120,00 | 1 212,00 | 606,00 |
| 6 | Грузовой автомобиль MAZ 6422 А8-332, 2010 г. в., рег. №АЕ 6210-3, цвет – белый, номер кузова (рама) Y3M6422A8A0001439, тип ТС – грузовой седельный тягач | 20 520,00 | 2 052,00 | 1 026,00 |
| 7 | Автокран МАЗ 533702 КС 35715, 2006 г. в., рег. №АА 4812-3, цвет – желтый, номер кузова (рама) Y3M53370260006673, тип ТС – грузовой специальный автокран | 35 640,00 | 3 564,00 | 1 782,00 |
| 8 | Автокран URAL 4320, 2007 г. в., рег. №АЕ 0994-3, цвет – синий, номер кузова (рама) 43200071341829/43200071341803, тип ТС – грузовой автокран | 50 400,00 | 5 040,00 | 2 520,0 |

Задаток перечисляется на расчетный счет 3012403517013 в «Приорбанк» ОАО ЦБУ 400 г. Гомель, БИК 153001749, получатель платежа – ООО «Центр эксперт услуг», назначение платежа: задаток для участия в аукционе согласно извещению в газете «Звязда» от 17.05.2017 г. по Лоту № (№ соответствующего лота).
